Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незакарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Замена адрасу: пашпартная — 20 к. пасылкова — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпартнай пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпартнай спераду тэксту 1 р. — к. За радок пашпартнай поруч тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. дарожай. Зоны чэрвоф бярэцца 10 проц. пашлоту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 сант. За кожны дадатковы — 15 „ Бескаштоўна і чэрвонаармейцы за дакумент — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

НАДПІСКА ПРЫМАЮЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 290 (2478) Аўторак, 18-га сьнежня 1923 г.

Да 7-й Менскай акруговай партканфэрэнцыі.

Сёньня пачынае сваю працу 7-я акруговая партыйная канфэрэнцыя.

Год працы акругкому і ўсёй парт-арганізацыі з часу 6-й акруговай партканфэрэнцыі праходзіў у вельмі складаных і цяжкіх абставінах. Пасьпяховае выкананьне ўсіх надзвычайна важных палітычных задач, ускладзеных на АК і Менскую партыйную арганізацыю,—АК лічыў магчымым пры ўмовах узмацненьня адзінства згуртаванасьці і росту палітычнай актыўнасьці ніжняга сябра арганізацыі пры яшчэ больш узмоцненай сувязі з масамі і пнуўхільным выкананьні дырэктыў партыі ва ўсіх галінах нашага будаўніцтва.

Пагэтаму, зразумела, што АК у цэнтры ўвагі ўвесь час меў задачу ідэйнага бальшавіцкага выхаваньня ўсёй арганізацыі. Той рашучы адпор, які атрымала контр-рэвалюцыйная трацкісцкая апазіцыя ў адказ на спробы рэвізіі ленінізму і расколу адзінства партыі ва ўсёй нашай арганізацыі, тая рашучая барацьба, якую вядзе партарганізацыя з правым ухілам і прымірэнчымі адносінамі да яго, зьяўляюцца лепшымі паказчыкамі сьвядомасьці і ідэйнай згуртаванасьці партыйнай арганізацыі акругі.

Дзякуючы своечасова разгорнутай працы па практычнаму выкананьню пастаноў 15-га зьезду УсеКП(б) пры напр жанай і згуртаванай рабоце—менская партыйная арганізацыя дабілася значных дасягненьняў у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Бальшавіцкае адзінства згуртаванасьці арганізацыі, зьвязанае з разгортваньнем унутры-партыйнай дэмакратыі і самакрытыкі, дало магчымасьць акруговаму камітэту і ўсёй партыйнай арганізацыі выканаць важнейшыя палітычныя задачы, высунутыя 15-м зьездам УсеКП(б) і намеціць далейшыя мерапрыёмствы па ажыцьцяўленьню неаслабнага тэмпу індустрыялізацыі, разгортваньню калектывізацыі і ўзмацненьню саюзу рабочае клясы з асноўнай масай сялянства—беднякам і серадняком, замацаваньню саюзу беднякоў з серадняком для больш рашучага наступу на кулака і ўзмацненьне сувязі з рабочымі масамі.

Цяжкасьці рэканструкцыйнага перыяду і абвастрэньне клясавай барацьбы ў вёсцы выклікалі ў асобных найменш устойлівых праслойках партыі хістаньні і сумненьні адносна правільнасьці шляхоў сацыялістычнага будаўніцтва, паказаных 15 зьездам партыі. Гэтыя няўстойлівыя праслойкі нашай партыі імкнуцца ставіць пытаньне аб пераглядзе пастаноў 15 зьезду партыі ў бок вымаўленьня курсу і паслабленьня тэмпу індустрыялізацыі ў бок недаацэнкі калектывізацыі сельскай гаспадаркі, а таксама—у бок паслабленьня націску на верхавінныя пласты вёскі.

Гэтыя спробы сустрэлі з боку Менскай арганізацыі рашучы адпор. Яшчэ кастрычнікавы пленум АК КП(б)Б, выражаючы думку ўсёй партыйнай арганізацыі, сказаў, што нам патрэбна весьці рашучую барацьбу з правым ухілам і прымірэнчымі адносінамі да яго, адначасова не паслабляючы барацьбы з рэшткамі разьбітай контрэвалюцыйнай былой трацкісцкай апазіцыі. У гэтым-жа духу выказалася ўся арганізацыя (гарадзкі актыў, раённыя партыйныя канфэрэнцыі, сходы ячэек). Гэта гаворыць аб тым, што менская арганізацыя цьвёрда стаіць на ленінскіх пазіцыях.

Падзеі, меўшыя месца ў апошні час на шэрагу прадпрыёмстваў, у БДУ, у асобных школах, дыскусія па пытаньню аб рэпэртуары тэатру, лісты ў рэдакцыю і г. д., сьведчаць аб росьце і актывізацыі шавінізму (рускі, беларускі, яўрэйскі, польскі), праяўленьні нацыянал-дэмакратычных тэндэнцый і правага ўхілу ў нацыянальна-культурных пытаньнях, зьяўляючыяся вынікамі націску варожых нам сіл і ахапіўшых асобных недастаткова-устойлівых камуністаў. Гэтыя падзеі, рост і актывізацыя шавінізму, праяўленьне нацыянал-дэмакратычных тэндэнцый атрымалі належны адпор з боку парт-арганізацыі, але ў гэтай галіне яшчэ шмат неабходна перамагчы для таго, каб зьшыць гэтыя зьявішчы. Мы упэўнены ў тым, што акруговая партыйная канфэрэнцыя, вырашаючы вельмі важныя пытаньні, падводзячы вынікі галавой працы і намячаючы далейшыя задачы, пытаньню барацьбы з ухіламі наогул, у прыватнасьці ў ухілам ў нацыянальна-культурных пытаньнях, супроцьпаставіць непрымірымую няўхільную генэральную лінію нашай партыі і ленінскую ідэалёгію.

Перад 7-й акруговай партыйнай канфэрэнцыяй стаяць вялікія задачы; гэта канфэрэнцыя будзе праводзіць сваю працу ў момант, калі неабходна яшчэ большае адзінства і згуртаванасьць нашай партыі, калі трэба мець яшчэ большую напружанасьць у працы па будаўніцтву сацыялізму, калі трэба разьвіваць нашу прамысловасьць, калі трэба праводзіць індустрыялізацыю такім тэмпам, каб дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны, калі трэба перабудаваць расыленыя сельскія гаспадаркі на рэйкі буйной калектыўнай сацыялістычнай гаспадаркі, калі трэба палепшыць усю працу з беднатой для таго, каб замацаваць саюз з серадняком для больш рашучага наступу на кулака, калі патрэбна падняць ураджайнасьць і г. д. Яшчэ шмат задач стаіць перад канфэрэнцыяй: пытаньні росту, бальшавіцкага выхаваньня арганізацыі, кіраўніцтва камсамолам, палепшаньне масавай працы, выніканьне сабекошту і г. д. Але-ж ужо гэта сказанае патрабуе ад усёй партыйнай арганізацыі і ў прыватнасьці ад партыйнай канфэрэнцыі напружанай працы для вырашэньня тых пытаньняў, якія перад намі пастаўлены.

Мы ўпэўнены ў тым, што 7-я акруговая партыйная канфэрэнцыя з бальшавіцкай упартасьцю вырашыць пасьлядоўна ленінскую ўсе пытаньні, якія стаяць у парадку дня, і намеціць далейшыя шляхі да далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Згуртаваным атрадам бальшавікоў, уладаючым вопытам і жаданьнем пабудаваньня сацыялізму Менская партыйная арганізацыя прыдзе да 7-й акруговай партыйнай канфэрэнцыі.

А. Славінскі.

Сэсія Лігі Нацый скончылася скандалам.

БАЛІВІЯ І ПАРАГВАЙ ДЫПЛЁМАТЫЧНА ЎХІЛІЛІСЯ АД ПАСРЭДНІЦТВА ЛІГІ.

Вострая стычка між Залескім і Штрэзэманам.

ЛУГАНО, 15-XII. Сэсія рады Лігі Нацый скончылася вострай стычкаю між Залескім і Штрэзэманам. Аб апошнім пункце парадку дня—абмеркаваньні 9 пятыцый нямецкае меншасьці ў польскай Верхняй Сілезіі, спрэчак не прадугледжвалася. З самага пачатку сэсіі з нямецкага боку было заяўлена, што Нямеччына зацікаўлена не ў бясконцым разглядзе шмат-якіх прыватных выпадкаў парушэньня правоў нямецкае меншасьці, а ў прынцыповай згодзе з Польшчаю аб усім комплексе спрэчных верхня-сілескіх пытаньняў. У выніку, без спрэчак быў ухвалены даклад, які радзіць альбо адкладаць асобныя пятыцыі, альбо затрабаваць дадатковую інфармацыю, альбо ўжываць іншыя фармальныя мерапрыёмствы. Пасьля ўхвалы дакладу, выступіў Залескі, які заявіў, што ініцыятар пятыцыі—нямецкая арганізацыя «Дэйчэр Фольксбунд», якая зьяўляецца «арганізацыяй дзяржаўнае здрады і эканамічнага шпіянажу і імкнецца падарваць кансалідацыю Верхняе Сілезіі». Заява Залескага аб тым, што далейшая цярпімасьць у адносінах да лейнасьці такіх арганізацый магла-б стаць пагрозаю міру ва ўсходняй Эўропе, перапыняюцца выгукамі і стукатам на стале надзвычайна ўскаляванага Штрэзэмана. «Нячувана», «агідна» і г. д. Пры напружанай цішыні залі, Штрэзэман, усё больш павышаючы голас, адказвае Залескаму вострую прамоваю. «Вусны Залескага—заявіў Штрэзэман,—гаворыць нянавісьць да нямецкае меншасьці і імкненьне прыдушыць яе барацьбу за правы, забясьпечаныя ёй Лігай Нацый. Спроба абярнуць дзелавы разгляд пятыцый у падобную палеміку можа быць растлумачана толькі нейкімі палітычнымі падставамі. Дзяржаўная здрада, аб якой казаў Залескі, часта вельмі адпаўкава па ідэі з разуменьем каханьня да бацькаўшчыны. У імя гэтага пачуцьця некаторыя з прысутных тут за сталом рады Лігі таксама ўчынялі тое, што Залескі называе дзяржаўнаю здрадаю. Цкаваньне нямецкае меншасьці пецярпіма. Калі-б Ліга ўзяла за аснову сваёй далейшай дзейнасьці пункт гледжаньня Залескага на правы нацыянальных меншасьцяў, дык яна тым самым падарвала-б адну з самых галоўных сваіх асноў—урачыста ўзятую ею на сябе абарону правоў нацыянальных меншасьцяў. Гэта прымусіла-б некаторыя народы перагледзець прычыны, якія прымусілі іх увайсьці ў Лігу».

У канцы Штрэзэмана патрабаваў, каб на бліжэйшую сэсію рады было пастаўлена прынцыповае пытаньне аб абароне Лігаю правоў нацменшасьцяў.

Няўдача „міралюбівага" гэсту Брыяна.

ЛУГАНО, 15-XII. Урады Балівіі і Парагваю прысылі адказ на тэлеграму Брыяна, у якой Брыян у якасьці старшыні рады Лігі Нацый выказваў пажаданьне ўпарадкаваць балівійска-парагвайскі канфлікт і прапанаваў пасрэдніцтва Лігі.

Балівійскі ўрад у адказе заяўляе, што згодзен распачаць мірныя перамовы толькі ў тым выпадку, калі атрымае ад Парагваю «маральнае адшкадаваньне». Парагвайскі ўрад у сваім адказе прапануе склікаць камісію прадугледжаную Угаворам аб упар дкаваньні канфліктаў між амэрыканскімі дзяржавамі.

У колах Лігі лічаць, што адказы Парагваю і Балівіі, асабліва апошняе, на справе даюць адказ умешаньню Лігі Нацый у балівійска парагвайскі канфлікт.

Сёньня адбылося зачыненае пасяджэньне рады Лігі Нацый для абмеркаваньня адказаў Парагваю і Балівіі. Водгук госстак, якія прайшлі ў друк, рада даручыла Брыяну сачыць за падзеямі і склікаць, калі будзе патрэбна, надзвычайную сэсію рады. Рада заканчэрдзіла праект тэлеграмы за подпісам Брыяна да варожых баноў. У абедзьвох тэлеграмах Брыян абмяркоўваецца парадамі ўнікнуць ваеннага апэрацыі і выкарыстаць прымірэнчую працэдуру, непрыстасаваньне якое, водгук слоў тэлеграмы, азначала-б парушэньне пакту Лігі Нацый. Брыян ня згодны прыстасаваць пасрэдніцтва Лігі Нацый для ўпарадкаваньня балівійска-парагвайскага канфлікту па сутнасьці, бо мізэдзін з варожых баноў не звярнуўся з адпаведнаю просьбою да Лігі.

Сапсаваная ўрачыстасьць.

ЛУГАНО, 15-XII. Зачыняючы сэсію рады Лігі Нацый, Брыян выказаў жаль, што вынікі палемікі зрабілі непрыемнае ўражаньне на ўсіх удзельнікаў сэсіі. Ён заявіў, што Ліга Нацый застанецца вернай свайму абавязацельству «абараняць сьвяшчэнныя правы нацыянальных меншасьцяў». У абставінах усеагульнага замяшаньня і прыдушанага настрою Брыян абвяшчае сэсію Рады Лігі зачыненаю.

ЛУГАНО РАСЧАРАВАЛА ГРАМАДЗКАСЬЦЬ НЯМЕЧЧЫНЫ.

БЭРЛІН, 16-12. Усе газэты абмяркоўваюць у перадавіцах скасаваньне сэсіі рады Лігі Нацый у Лугано, прычым адназгодна зазначаюць, што перамовы не далі нічога нечаканага ні ў добрым, ні ў дрэнным сэнсе, і што значных зьмен у поглядах баноў не заўважана. Перспэктывы далейшых перамоў аб эвакуацыі і рэпарацыях нямецкі друк ацэньвае песымістычна. Орган партыі цэнтру „Нямеччына" ставіць пытаньне, ці не належыць Нямеччыне зьняць з сэрыі міжнародных перамоў пытаньне аб эвакуацыі, паколькі пытаньне гэтае кожны раз выклікае ўсё новыя і большыя патрабаваньні з процілеглага боку.

Усе газэты з здаволеньнем адзначаюць востры тон Штрэзэмана Залескаму. Прамова Штрэзэмана разглядаецца, як абгрунтаваны адпор польскай прапаганды. «Дойтшэ Альгемэйнэ Цэйтунг» бачыць у «вострым адказе на польскую бессаромнасьць» довад зьяўленьня ў замежнай палітыцы Нямеччыны „новае дынамікі", якое дамагаўся рэйхстаг.

АЎСТРА-ВЭНГЕРСКІ ЗГАВОР У ЛУГАНО.

ВЕНА, 15 XII. Аўстрыйскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што «вэнгерскі прэм'ер Бэтлен, едучы з Лугано, наведаў аўстрыйскага саюзнага канцлера Зэйпеля. Яны закранулі ў гутарцы усе палітычныя пытаньні цаконт агульных інтарэсаў Аўстрыі і Вэнгрыі. У выніку прыцельскае гутаркі абодвы прэм'еры адзначылі поўнае адзінства погляду у асноўных пытаньнях іх палітыкі.

Зачынілася 4-я сэсія ЦВК СССР.

УСЕ ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ ЎХВАЛЕНЫ СЭСІЯЙ АДНАЗГОДНА.

МАСКВА. А 6-й гадз. увечары 15 гасьнежня распачалося аб'яднанае пасяджэньне Саюзнага Савету і Савету Нацыянальнасьцяй. З заключным словам па дакладзе аб агульных асновах землеўпарадкаваньня і землякарыстаньня выступіў т. Мілюціи, які адзначыў агульную адналушнасьць у прынцыповым баку справы і пав'даміў аб папраўках да законапраекту, ухваленых камісіяй.

Далей, паасобным галасаваньнем абедзьвюх палат сэсія адназгодна ўхваліла новы закон аб землеўпарадкаваньні і землякарыстаньні.

Слова для дакладу аб працы камісіі, якая абмяркоўвала праект закону аб ураджайнасьці, мае т. Калінін. Камісія разглядзела папраўкі, спрэд якіх ня было ніводнае з прапанаваю прынцыповых зьмен у праекце. Пасьля паведамленьня Калініна сэсія адназгодна ўхваліла закон аб павялічэньні ўраджайнасьці.

Пасьля гэтага сэсія заслухала даклад т. Парайка аб пастановах, ухваленых прэзыдыумам ЦВК між сэсіямі. Сэсія зацьвярджае ўхваленыя прэзыдыумам ЦВК законы, а прапанову т. Парайка наконт новых нашых законаў і пытаньня аб іх кадыфікацыі сэсія перадае на разгляд прэзыдыуму ЦВК.

Сэсія зацьвярджае бюджэт пасьля дакладу т. Любімава аб працы бюджэтнае камісіі. Апошняя пастанова, ухваленая сэсіяй, была ўхвалена пасьля паведамленьня т. Айдакова аб працы камісіі па дакладзе ўраду Узьбецкае рэспублікі.

Сэсія зачынілася прамоваю тав. Чарвякова, які падагуліў вынікі яе працы.

ЗАБАРОНА КАМУНІСТЫЧНЫХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ У БЭРЛІНЕ.

АРЫШТЫ СЯРОД ЧЫРВОНЫХ ФРАНТАВІКОЎ.—КАМПАРТЫЯ КЛІЧА РАБОЧЫХ ДА ПРАТЭСТУ.

БЭРЛІН, 15-XII. Прапанова кампрактыі прускага ландтагу неадкладна ж адмяніць загад аб забароне сходаў і дэманстрацый у Бэрліне адхілена галасамі ўсіх фракцый ад нацыянал-сацыялістаў (фашысты) да сацыял-дэмакратаў.

На падставе загаду арыштавана 22 члены саюзу чырвоных франтавікоў, якія пасьля наладжанага імі сходу пратэсту проці забароны разыходзіліся дамоў.

Райённыя бэрлінскія арганізацыі камуністычнае партыі, камсамолу і чырвонага саюзу франтавікоў зьвярнуліся да бэрлінскага пралетарыяту з заклікам наладзіць на прадпрыёмствах прафсаюзах і ў масавых арганізацыях масавыя пратэсты проці забароны сходаў і дэманстрацый.

Рэакцыйны бунт у Аўганістане напярэдадні ліквідацыі.

СТАЎКА АНГЛІІ НА ЦЁМНЫЯ ПЛЯМЕНЬНІ ПАБІТА.

КАБУЛ, 16-XII. Паўстаньне пляменьня шынвары ў Джалалабадзкай правінцыі, якое выбухнула ў спрэдзіне лістапада на грунце незадаволеньня рэформамі Амануллы, у сучасны момант знаходзіцца напярэдадні ліквідацыі. Паўстаўшым удалося раней пазбаў захапіць частку Джалалабадзкае правінцыі і абкружыць горад Джалалабад. Аднак усе спробы паўстанцаў заняць горад былі адбіты гарнізонам. У сучасны момант пад Джалалабадам адбываюцца перамовы між прадстаўнікамі ўраду і паўстанцамі, якія з прычыны няпосьпеху паўстаньня, як відаць, гатовы скласьці зброю.

Урацавыя колы Кабулу лічаць пажаданым дасягнуць ліквідацыі паўстаньня мірным шляхам, лічачы, што паўстанцы зьяўляюцца ахвярамі «староннягa ўплыву, які знаходзіцца па той бок аўгана-індыйскае мяжы».

Становішча ўраду моцнае. Усе прагрэсыўныя элементы безагаворачна падтрымліваюць Амануллу і яго ўрад у барацьбе проці рэакцыі, якая рукамі фанатычных дзікіх пляменьняў і пры дапамозе звонку спрабуе сарваць рэформы і працу па аднаўленьні краю.

ВОСЬ ЁН, ПАДБУХТОРШЧЫК ДА БУНТУ.

КАБУЛ, 15 XII. Газэта „Амані Аўган" перадрукоўвае з ангельскае газэты „Сэнтэй Экспрэс" артыкул аб вядомым ангельскім аг-нце, палкоўніку Лярэнсу. У артыкуле гаворыцца, што Лярэнс быў камандзіраваны з сэкрэтай місіяй у Аўганістан для падрыхтоўкі падпісаньня гандлёвага і вайсковага ўгавораў між Англіяй і Аўганістанам. Для гэтае мэты Лярэнс пераебраўся на аўганскую тэрыторыю і прыняў там, пішы шы выглядзе мусульманскае духоўнае асобы сярод горных пляменьняў. Нядаўна Лярэнса бачылі ў Мен-Міраншаху, дзе знаходзіцца аддзел з пэтрагу ангельскіх паветраных сіл.

Газэта «Амані Аўган» дзівіцца, як можа Лярэнс падрыхтоўваць у гарах Аўганістану, ды яшчэ ў сэкрэтным парадку, грунт для падпісаньня гандлёвага ўгавору, а таксама якое дачыненьне да гандлёвага і вайсковага ўгавораў маюць горныя пляменьні і перапрацаваньне Лярэнса.

Эканамічнае банкроцтва Эстоніі.

РЭВЕЛЬ. У зьвязку з пагоршаньнем эканамічнага становішча Эстоніі ў выніку неўраджаю, абанкроціліся шмат-якія гандлёвыя фірмы. Орган сацыял-дэмакратаў «Рахва Сэна» патрабуе высьветліць прычыны банкроцтваў, «бо гэта пагражае парушыць і без таго слабыя асновы гаспадарчага жыцьця Эстоніі».

«Рахва Сэна» паведамляе таксама пра РОСТ БЕСПРАЦОЎЯ І ПАГОРШАНЬНЕ СТАНОВІШЧА РАБОЧЫХ НАОГУЛ У ВЫНІКУ УЗРАСТАЮЧАЕ ДАРАГОЎЛІ.

УРАД РЭЯ НАМЕРАН РАТАВАЦЬ КРАЙ ПРАЗ ГАНДЛЁВЫЯ СУВЯЗІ З СССР.

РЭВЕЛЬ, 15-13. Учора ў дзяржаўным зборы (парляманце) мой прэм'ер, сацыял-дэмакрат Рэй, зачытаў урадавую дэкларацыю.

У частцы, якая датычыць СССР, дэкларацыя кажа: „Урад лічыць вельмі патрэбным падтрымліваць добрасуседзкія адносіны з Савецкім Саюзам; трэба наладзіць эканамічныя зносіны між Эстоніяй і СССР, у ніх зацікаўлены абедзьве дзяржавы".

РАЗРЫЎ МІЖ МАСАМІ І ГАМІНДАНАМ ПАГЛЫБЛЯЕЦЦА.

ЗА АДСТАЎКУ МІНІСТРАЎ-ПАСЛУГАЧОЎ ІМПЭРЫЯЛІЗМУ.

ПЕКІН, 15-XII. Сёньня адбыўся масавы мітынг, скліканы таварыствам для правядзеньня байкоту японцаў. Мітынг, на якім удзельнічала больш 2-х тысяч чалавек, ухваліў рэзалюцыю, дзе выказваецца за неадкладнае скасаваньне ўсіх няроўных угавораў з дзяржавамі, за адстаўку пакінскага міністра замежных спраў і міністра фінансаў, з прычыны іх нерашучае пазіцыі у адносінах да Японіі. Рэзалюцыя далей патрабуе, каб урад не аднаўляў перамоў з Японіяй, пакуль ня будзе выведзена японскае войска з Шандуню.

Па мітынгу быў выкрыт японскі жандар, апрануты ў цывільнае адзеньне. Мецца натоўпу, ён быў дастаўлен у мясцовае аддзяленьне японскае жандармерыі.

ПАШЫРЭНЬНЕ САВЕЦКА-КІТАЙСКАГА ГАНДЛЮ.

АНДЫЖАН, 15-XII. Апошнія тыдні далі значнае павялічэньне грузаабароту між СССР і Заходнім Кітаем. Толькі ў другі тыдзень сьнежня з Заходняга Кітаю праз Омскую граніцу вывезена ў СССР 50 тысяч кілёграмаў бамбуковага сахару і 32 тысячы кілёграмаў воўны, у той час, як за ўвесь лістапад было вывезена толькі 65 тысяч кілёграмаў грузу. З СССР у Заходні Кітай за лістапад за першую палову сьнежня вывезена ідзе 150 тысяч кілёграмаў розных арматураў.

Сёлета перавозка грузаў між СССР і Кітаем будзе праводзіцца ў працягу ўсяе зімы. Для гэтае мэты недалёка ад горнага перавазу Суні-Курган заснаўваецца спэцыяльны перавалачны пункт «Совторгфлота».

Павялічэньне пэнсіі французскім дэпутатам

ПАРЫЖ, 14-12. Агенцтва Гаваса паведамляе, што палата дэпутатаў ухваліла павялічыць дэпутацкую пэнсію з 45-ці т. франкоў у год да 60-ці тысяч.

КАМФРАКЦЫЯ ГАЛАСАВАЛА ПРОЦІ ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ.

ПАРЫЖ, 14-XI. Пры галасаваньні законапраекту аб павялічэньні пэнсіі дэпутатам камфракцыя палаты дэпутатаў выступіла з заявай, што фракцыя галасуе проці законапраекту.

Савецка-турэцкая дружба мацнее.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 16-XII. Газэты зьмяшчаюць у вытрымках даклад т. Літвінава на сэсіі ЦВК СССР пад загалоўкам: «Савецка-турэцкая дружба пашыраецца з кожным днем». Газэта «Вакыт» піша: „Прыязьнь між абодвымі краямі вышэй за ўсё".

Помнік Амундсэну.

ОСЛО, 16-XII. На бацькаўшчыне Амундсэна, каля Сарпсборгу, пастаўлен помнік вялікаму каследу.

У Саюзных Рэспубліках.

Рабочыя не сьвяткуюць каляд.

АРЦЁМАЎСК, 17-XII. Рабочыя капальні «Мар'я» адмовіліся сьвяткаваць каляды. Заклік Горлаўскіх капальнікаў адмовіцца ад сьвяткаваньня каляд спаткаў згоду з боку ўсіх рабочых іншых капальняў.

* * *

КАЗАНЬ, 17-XII. Рабочыя некалькіх цэхаў Вахітаўскага заводу ў сваіх пастановах цьвёрда заяўляюць аб сваёй адмове сьвяткаваць каляды. Вахітаўцы выклікаюць рабочых іншых прадпрыёмстваў Казані ўзяць з іх прыклад.

ІВАНАВА-ВАЗЬНЯСЕНК, 17-XII. Іванаўскія тэкстыльшчыкі ўхвалілі працаваць на каляды. Такія-ж пастановы ўхвалены і на шмат-якіх буйных фабрыках губэрні. Да іх далучыліся таксама і вучні.

* * *

ТУЛА, 17-XII. Рабочыя і служачыя на сходах і лятучых мітынгах адмаўляюцца сьвяткаваць дні 25-га і 26-га сьнежня. Да гэтага погляду рабочых і служачых далучаюцца таксама некаторыя хатнія гаспадыні.

Шпіянаж грузінскіх меншавікоў на Каўказе.

САБРАНЫЯ ВЕСТКІ ПРАДАВАЛІСЯ ГЕНШТАБАМ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫХ ДЗЯРЖАЎ.

ТЫФЛІС, 15-XII. У мясцовай прэсе агалошаны матар'ялы, якія ўстанаўляюць, што меншавікі Грузіі, згодна дырэктывы заграничнага бюро меншавікоў, займаліся вайсковым шпіянажам на карысьць замежных дзяржаў. У ліпені 1928 г. быў арыштаваны ўпаўнаважаны заграничнага бюро Пірцкалаішвілі, які перасылаў для Ноя Жарданія і Раміішвілі лісты з матар'ялмі вайскова-шпіёнскага характару. Пасьля арышту Пірцкалаішвілі заявіў, што сабра ЦК грузінскае сацыял-дэмакратычнае партыі Пуладзе спецыяльна даручыў яму зьбіраць матар'ялы вайскова-разьведчага характару і перасылаць іх у заграничнае бюро. «За час маёй працы,—піша Пірцкалаішвілі, які быў фактычна кіраўніком меншавіцкае нелегальнае арганізацыі Грузіі з ліпеня 1926 г. да дню арышту—удалося наладзіць збор патрэбных матар'ялаў. Гэтыя весткі датыкаліся Каўкаскае Чырвонаназнаменнае арміі і сабраны асобна ў Арменіі, Азэрбайджане і Грузіі. Усе матар'ялы перадаваліся прадстаўнікам замежных дзяржаў за адпаведную аплату, у чым я глыбока перакананы».

Выбарчая пераклічка-спаборніцтва гарсаветаў.

БЕДНАТА ДАЕ АДПОР КУЛАКОМ.

БАКУ, 17-XII. Бакінскі савет паслаў Харкаўскаму гарсавету выклік на спаборніцтва за лепшае правядзеньне справаздачна-перавыбарчае кампаніі.

З павету ёсьць весткі пра кулацкія выступленьні ў зьвязку з перавыбарчай кампаніяй. Так, у Джэбраільскім павеце кулакі (якія займаюцца гадоўляю баранаў) зьверскі зьбілі трох парабкоў за тое, што тыя прасілі гаспадароў пусьціць іх на перавыбарчы сход; у вёсцы Карахандзілі (Джэбраільскага павету) кулакі ўзмоцнена агітавалі сярод сялян і сялянак проці ўдзелу жанчын на выбарчых сходах. Выступленьні кулакоў беднякі ва ўсіх мясцовасьцях процістаўляюць вялікую сваю актыўнасьць. Беднякі выганяюць кулакоў, якія спрабуюць прайсьці на сходы беднаты і пасяджэньні сельсаветаў. У Шамахінскім павеце, дзе сходы беднаты прайшлі з асабліваю ўзьмахам, згодна пастановы сходаў беднаты і сельскіх сходаў зачынена 8 бажніц (мячэцяў), памяшканьні якіх перададзены пад школы.

Здольны бараніць заваёвы Кастрычніка.

ЛЕНІНГРАД, 15-12. У Маскоўска-Нарвускім райёне была праведзена хімічная трывога. А 13-й гадз. дню сыгналы апавясьцілі пра ўмоўнае набліжэньне паветранага ворага з боку Троцку.

Праз 5 хвілін завод «Красный химик», які быў намечан аб'ектам умоўнага паветранага нападу, быў апавешчан гулам заводзкае сірэны аб набліжэньні ворага. Рабочыя ня былі папярэджаны. Не зважаючы на гэта, заводзкая каманда дэкасатараў праз паўтары хвіліны зьявілася на месца разрыву першае ўмоўнае бомбы. Вельмі ўдала была пастаўлена дымавая заслона над «Красным Химиком» і суседнім «Красным Путиловцем». Начальнік паветранае абароны гораду адзначыў поўны посьпех вучэньня.

УРКВАРТ ІЗНОЎ ДАМАГАЕЦЦА КАНЦЭСІІ.

КАНЦЭСІЙНЫ ПЛЯН БУДЗЕ ВЫКАНАН.

МАСКВА, 15-XII. У сучасны момант разглядаецца цалы шэраг сур'ёзных канцэсійных прапаноў па здобычы вальфрамавых і валаваных руд, на эксплёатацыю залежаў жывога срэбра, на выраб гідрасамалётаў, вялёсыпэдаў, штучнага шоўку і шляхавага і квадэрнага будаўніцтва. Сярод фірмаў, якія згодны ўзяць канцэсіі знаходзяцца нямецкія, французскія, галандзкія і амэрыканскія фірмы. Ангельскія прамыслоўцы адгукнуліся таксама на агалошэньне канцэсійнага пляну. Так, напр. ёсьць прапанова ад Урквартэ даць яму канцэсію па распрацоўцы каляровых металаў і вугольных месцародаў. Усе прапановы дакладна распрацоўваюцца ў гаспадарчых і навуковых установах.

8-МЫ ЎСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ.

Даклад дэлегацыі УЦСПС у Прафінтэрне.

МАСКВА. 15-га сьнежня на ўсесаюзным зьезьдзе прафсаюзаў быў заслухан даклад Лазоўскага ад імя дэлегацыі УЦСПС у Прафінтэрне. Далей, на ранішнім і вячэрнім пасяджэньнях адбываліся спрэчкі па справаздачы дэлегацыі. Сярод выступаўшых былі Польліт і Манмусо.

Пасьпешны ход савецка-нямецкіх перамоў.

МАСКВА. 15-га сьнежня ўвечары адбылося пленарнае пасяджэньне дэлегацыі СССР і нямецкае дэлегацыі па эканамічных перамовах між СССР і Нямеччынаю. Пасяджэньне мела на мэце канчаткова аформіць распрацаваныя ў падкамісіях за апошні час пытаньні.

Як нам паведамляюць, праца канфэрэнцыі ідзе такім тэмпам, які дае магчымасьць спадзявацца на самае хуткае сканчэньне перамоў.

Рабочыя перадаюць найлепшых у партыю.

ПЕРМ, 16-XII. Гарадзкую партыйную канфэрэнцыю ад імя 15-ці тысяч рабочых Пермі прывіталі беспартыйныя рабочыя, якія перадалі ў партыю 35 рабочых — гарамадзкіх дзеячоў, і заявілі, што толькі з партыяй Леніна яны ўяўляюць сабе далейшую барацьбу за індустрыялізацыю краю, і што часовыя цяжкасьці іх ня пужаюць.

Канфэрэнцыя ўхваліла адназгодна рэзалюцыю за адзінства партыйных радоў. Апрача таго, рэзалюцыя адабрае пастановы лістападаўскага пленуму.

На 7-мігадзінны дзень.

НІЖНІ-НОЎГАРАД, 15-XII. Першы на 7-мігадзінны дзень Вахтанскі канфольна-шпігінаравы завод. Пераход урачыста адсьвяткаваны ўсімі рабочымі.

Марскі рэйс Ленінград-Уладывасток.

ЛЕНІНГРАД, 15-XII. Адноўлен марскі рэйс Ленінград—Гамбург—Чорнаморскія партыі—Уладывасток. Увесь шлях мае больш 14-ці тысяч міль. У гэты рэйс з Ленінграду вышаў пароход савецкага гандлёвага флёту «Декабрыст».

Рух у Англіі за зносіны з СССР.

ЛЁНДАН, 16-XII. Макдональд, выступаючы ў адным з лёнданскіх клюбаў, заявіў: «Нават найбольш тупагаловыя і ўпартыя члены ўраду павінны вразумець, што сучаснае становішча дачыненьняў з Расеяй ня можа цягнуцца так далей. Чымся будзе раней Расея дыплёматычна прызнана, тым лепш».

ЛЁНДАН, 15-XII. «Манчэстэр Гардыян», абмяркоўваючы прамову Бутбі, піша: «Гэтая гутарка зьяўляецца вядомым пацьверджаньнем чутак, што пытаньне аб аднаўленьні гандлю з Расеяй нядаўна абмяркоўвалася членамі ўраду».

Спыняючыся далей на заяве Бутбі аб тым, што савецкі ўрад павінен зрабіць першы крок, «Манчэстэр Гардыян» піша: „Такое выйсьце трэба было-б вітаць, але, баручы пад увагу мілёны нашых беспрацоўных, ці можам мы вымагаць, каб з-за пустое фармальнасьці рупыўся выгадны гандаль».

АЛЬБЭР ТОМА ХАВАЕЦЦА АД РАБОЧЫХ.

ТОКІЁ, 15-XII, Дырэктар міжнароднага бюро працы пры Лізе Нацый Альбэр Тома, які ў сучасны момант знаходзіцца ў Токіё, заверыў кіраўнікоў лідэраў прафсаюзнага руху і левых партый „для прыцяльнае гутарні з мэтаю вызьніць непаразуменьні". Левая рабоча-сялянская партыя, а таксама левыя прафсаюзы адхілілі прапанову Тома і прапанавалі каладзіць публічнае абмеркаваньне „непаразуменьняў" на масавым мітынзе. Сёньня кіраўнік тоційскага аддзяленьня міжнароднага бюро працы зьвярнуўся да гэтых арганізацый з лістом, у якім адхіляе іх прапанову, грунтуючыся на тым, што „дыскусіі паслужыць толькі для мэтаў левае прапаганды".

Іо гадоў у авангардзе барацьбы польскіх пралетарыяў.

Прывітаньне кампартыі Польшчы ад выканкому Камінтэрну.

*МАСКВА. 16-XII.

Пастанова IV пленуму ЦК КП(б)Б

па дакладу тав. Калініна „аб выніках працы за год і далейшых задачах ЦКК РСІ".

1. Пленум ЦКК асноўнымі дасягненьнямі ў рабоце органаў ЦКК РСІ за мінулы год лічыць:

а) васьляховым вынікі ўцягненьня мас у работу РСІ (рабочыя засяданьні дабраахвотнікі, прыцягненьне да праверкі рабочых, выбраемых рабочымі сходамі, удзел у праверцы дырэктыў візавых прафарганізацыяў) і ваданьне шырокай гласнасьці рабоце і мерапрыемствам КК-РСІ па барацьбе з бюракратызмам праз друк і масавыя сходы;

б) сыстематычная праверка выкананьня дырэктыў партыі і ўлады па забесьпячэньню тэмпу капітальнага будаўніцтва па рацыяналізацыі прамысловасьці і дзяржапарату і па ўзмацненьню сацыялістычнага сэктару ў вёсцы;

в) рашучае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб самакрытыцы шляхам барацьбы са спробамі звужаць і абмежваць самакрытыку барацьбы з прасьледваньнямі раб сёлькораў за самакрытыку, з ігнараваньнем прававой рабочых, а таксама шляхам ачышчэньня партыі ад разлажыўшыхся, ізарваўшыхся ад партыі і мас элементаў і барацьбы супроць астаткаў трацкісцкай апазіцыі.

2. Аднак, ва ўзовах стаячых перад партыяй і рабочай клясай задач паскораньня тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва, лютай барацьбы з наступленьнем варожых клясаў і скажэньнямі палітыкі партыі, якія пасла блокаў тэмп нашага будаўніцтва, барацьбы з бюракратызмам і за арыбочаньне дзяржапарату, ідасягнутыя вынікі патрабуюць у далейшым яшчэ больш рашучага ўзмацненьня дзейнасьці органаў ЦКК РСІ праз разгортваньне масавага кантролю на падставе самакрытыкі, дамагаючыся бязумоўнага і хуткага выкананьня дырэктыў XV з'езду і запозненага пленуму ЦК УсеКП(б), павышаючы адказнасьць КК РСІ за своечасовае выяўленьне недахікаў і бюракратычных балачак і пастаноўку іх перад вышэйшымі вэрторганамі. Барацьба з правай небясьпекаю на лініі КК РСІ, не аслабляючы барацьбы з астаткамі трацкісцкай апазіцыі, вайінна выказана ў рашучым вакіраваньні агню супроць «імкненьняў вынізць тэмп і затрымаць далейшае будаўніцтва буйнай індустрыі, нядбайных ці адмоўных адносін да кал. гасподарак і сав. гасподарак, недаважнасьці і затушоўваньня клясавай барацьбы у прыватнасьці, барацьбы з кулаком, бюракратычнай пануважлівасьці да патрэб мас, недаацэнкі барацьбы з бюракратызмам» (з рэз. пленуму ЦК УсеКП(б).

3. У далейшай рабоце лічыць необходнымі:

а) У справе ўцягненьня шырокіх мас у работу РСІ, лічачы маючыяся вынікі толькі першымі крокамі, пленум ЦКК у пацьвярджаньне пастановы 3-га пленуму ЦКК, даручае прэзыдыуму ЦКК і ўсім АКК асаблівую ўвагу зьвярнуць на арганізатарскую работу з прыцягваемымі і іх навучаньню, за больш шырокае ўцягненьне праз вытворчыя нарады і эканомкамісіі і абіраемых на агульных сходах рабочых, справаздачасьць перад рабочымі масамі і вылучэньне рабочых вызначаных сябе актыўна ў справе барацьбы з бюракратызмам;

б) важнейшай і асноўнай задачай КК РСІ павінна быць—сыстематычная, неаслабная праверка выкананьня дырэктыў аб самакрытыцы, партыйнай, савецкай (рабочай) самакрытыкі, барацьба з глушыцелямі самакрытыкі і з пэўнаважлівымі адносінамі, ігнараваньнем прававой і самакрытыкі мас, рашучае сазейнічаньне і заахвочваньне ініцыятывы мас зьнізу па зьнішчэньні недахопаў і бюракратычных скажэньняў, узмацненьне барацьбы са скажэньнямі палітыкі партыі ў вёсцы, ажыцьцяўляючы сувязь з батрацтвам, беднатой праз арганізуемыя сэкцыі РСІ пры саветах, уваўнаважаных бюро скаргаў;

в) з укладненьнем работы КК РСІ пленум даручае прэзыдыуму асобна зьвярнуць увагу на ўдасканаленьне апарату і ўсё дзейнасьці КК РСІ, дабіваючыся хутчэйшага разгаваньня на запросы мас і зьнімчэньне шматлікасьці кантролю. Пленум адабрае рашэньне прэзыдыуму аб перыядычных выездах членаў прэзыдыуму на месца для дапамогі і інструктаваньня ў рабоце КК. Побач з гэтым пленум даручае вельмі кіраваньне дзейнасьцю АКК-РСІ такім чынам, каб былі рашуча зжыты зьявішчы насьмеласьці і несваечасовага, недастатковага рэагаваньня на буйнейшыя парушэньні, адзначаныя па асобных КК (Мазырская і Аршанская).

г) шэраг грубых парушэньняў рэвалюцыйнай законнасьці выкрытых расьледваньнямі прэзыдыуму ЦКК, патрабуюць далейшага ўздараўленьня дзейнасьці судова-сьледчых органаў і пракуратуры, спыніўшы ўсялякія спробы замазваньня віны і незаконнага ўмяшальства ў работу суду, дабіваючыся ўзмацненьня і хуткасьці дзейнасьці суду ў барацьбе з грубейшымі праяўленьнямі бюракратызму, валакіты і скажэньняў дырэктыў партыі;

д) працягваючы далейшае сьмелае і рашучае правядзеньне рацыяналізацыі дзяржапарату ў бліжэйшы перыяд, аднэй з галоўнейшых задач павінна быць чыстка апарату ад чужых і злосна-бюракратычных элементаў, і рашучае арабочаньне апарату прычым пленум ЦКК выказваецца за неабходнасьць правядзеньня гэтай работы гласна, з шырокім прыцягненьнем рабочых мас, друку, партыйна-савецкай грамадзкасьці, устанавіўшы стражайшую адказнасьць кіраўнікоў устаноў за прыём вычышчаных.

е) адзначаючы станоўчыя вынікі прыцягненьня прафсаюзаў, у асаблівасьці паасобных візаных ячэек да непасрэднай праверкі выкананьня пастаноў РСІ, абавязаць КК РСІ ўстанавіць сыстематычную праверку выкананьня дырэктыў (праверка 20 проц. зьвяжэньня). Пленум ЦКК, не здавальняючыся гэтым, лічыць неабходным яшчэ ў большай меры прыцягненьне прафсаюзаў да масавай праверкі зьвяжэньня выдаткаў, зьвяжэньня сабекошту і рацыяналізацыі прамысловасьці, у сувадаваснасьці з рашэньнямі жнівеньскага пленуму ЦКК УсеКП(б), вялучы барацьбу са зьявішчамі пануважлівасьці, безтвіцыятыўнасьці паасобных прафсаюзных органаў да гэтай важнейшай задачы ўдзелу мас у дзейнасьці Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі. Пленум ЦКК заклікае прафсаюзныя арганізацыі да ўзмацненьня сувязі з органамі РСІ, да пастаноўкі пытаньняў і прававой перад імі і праверкі выкананьня сваіх пастаноў шляхам даручэньняў парт. ячэйкам, прафорганам, вытворчым нарадам і эканомкамісіям.

ж) справа праверкі і сазейнічаньня па выкананьню дырэктыў і мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьню пасэўнай кампаніі вабывае асаблівае значэньне. Неабходна ў далейшым, асабліва ў наыходячую вясеньнюю пасэўкампанію, згрупаваць увагу на праверцы правядзеньня ў жыцьцё ўсіх мерапрыемстваў па падняцьню ўраджайнасьці і павялічэньні пасэўнай плошчы, па ўмацаваньню і пашырэньню сацыялістычнага сэктару на вёсы (саегасы, калгасы, і інш. вытворча каапэрацыйныя арганізацыі), на падставе рашэньняў лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) зьвярнуўшы асаблівую увагу на правільнае прымяненьне кантрактацыі, як адзін з мэтадаў узьдзейнічаньня на індывідуальную гасподарку.

з) У барацьбе за адзінства партыі, супроць парушэньняў партдысцыпліны і парт. этыкі, задачай КК зьвяўляецца рашучая барацьба з ухіламі ў партыі „на два фронта", асабліва з правым ухілам, найбольш небясьпечным у сучасны момант і прымірэнчымі адносінамі да яго, чыстка партыі ад перарадзіўшыхся элементаў.

4. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на:

1) узмацненьне выхаваўчых метадаў барацьбы ў ячэйках з хваравітымі зьявішчамі шляхам праверкі якасьці ідэйнага выхаваньня, утварэньня грамадзка-партыйнай думкі навакол іх, асьвятленьня ў друку;

2) прыцягненьне да адказнасьці за праяўленьні сямейнасьці, падхалімства;

3) узмацненьне барацьбы за правільнае правядзеньне нацпалітыкі і супроць парушэньняў інтэрнацыянальнага адзінства як у партыі, так і ў рабочай клясе, з праяўленьнем шавінізму, асаблівую ўвагу зьвярнуўшы на барацьбу з антысэмітызмам.

4) узмацненьне мер ідэйна-выхаваўчага характару на барацьбе з выхадамі з партыі больш адсталых рабочых, работніц, батракоў, беднаты;

5) узмацненьне сувязі з ЛКСМБ у накіраваньні дапамогі і сазейнічаньня ў барацьбе з хваравітымі зьявішчамі ў ЛКСМБ.

6. Даручыць прэзыдыуму ЦКК і АКК распрацаваць падрыхтоўчыя мерапрыемствы ў адносінах да правядзеньня чысткі партыі на падставе вопыту мінулых праверак.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Канф'скацыя газэты.

Віленскі стараста сканфіскаваў № 33 расейскай газэты «Наша Жизнь».

Забастоўка на фабрыцы „Фартуна".

На віленскай фэбр. цукеркаў „Фартуна" выбухнула забастоўка. Палова работнікаў мінула працу. Забастоўна вынікла з прычыны адмовы дырэкцыі падвысіць плату.

Бандыцкі напад.

Гэтымі днямі каля Лужкоў з лесу выйшла група ўзброеных людзей і накінулася на праязджаўшых падарожных. Аграбіўшы іх, бандыты ўцяклі.

Беларускія календары ў Вільні.

Апрача «Беларускага календара на 1929 г.», выданага «Віл. выдавецкім т-вам», выйшаў з друку ў Вільні яшчэ «Беларускі народны календар на 1929 г.».

Беларускія каапэратывы.

«Кур. Віл» (№ 285) паведамляе, што на абшарах Віленска-Троцкага і суседніх паветаў закладаюцца беларускія спажывецкія каапэратывы. Падгатаваўчая праца ідзе вельмі інтэнсыўна.

„Дзеньнік Віл." пад судом.

Вядомая чорнасотенная польская газэта «Дзеньнік Віл.» вельмі бывае рада, калі канфіскуюць якую-небудзь беларускую газэту ці арыштоўваюць беларускага рэдактара. Але вось быў сканфіскаваны «Дзеньнік Віл.» і рэдактар яго п. Кодзь быў запікан у суд. У судзе рэдактару заявілі, што ён можа быць выпушчан на волю толькі пад залог. П. Кодзь не згадзіўся на гэтую меру, матывіруючы тым, што да апошняй пары па справах друку, які стаіць на грунце польскай дзяржаўнасьці, не вымагалася ўзносу залогу. Пасьля недоўгіх перагавораў суд выпусьціў упрывілеяванага п. Кодзя пад „слова гонару".

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Водгукі на сьмерць старшыні Мазырскага акрвыканкому тав. Цыганкова.

(Г. Мазыр).

Учора на 15 сьнежня ў Менску памёр старшыня Мазырскага акрвыканкому т. Цыганкоў.

Аб яго сьмерці зраніцы ўжо ведаў увесь горад.

На ўсіх установах і арганізацыях, а таксама на многіх прыватных дамах вывешаны жалобныя сьцягі.

Узьнята хадайніцтва аб перавязеньні ў Мазыр цела т. Цыганкова.

Агульны сход супрацоўнікаў акрвыканкому і ўсіх акруговых аддзелаў пастанавіў паслаць дзелегацыю для ўдзелу ў перавязеньні цела нябожчыка. Выказана спачуваньне акружному партыі і сям'і нябожчыка.

Пастаноўлена хадайнічаць аб выдачы сям'і т. Цыганкова персанальнай пэнсіі, а таксама аб зьмене назвы адной з вуліц гораду на вуліцу імя Цыганкова.

ПРАФСАЮЗЫ ДАПАМАГАЮЦЬ ВЯСКОВАЙ БЕДНАЦЕ.

Гомель, 17-XII. Саюзныя арганізацыі Гомельшчыны разгортваюць працу па правядзеньню перавыбараў саветаў. Асабліва вялікую працу правёў саюз сельска-гаспадарчых рабочых. Саюзам праведзен шэраг канфэрэнцый, у кожным райёне выдзелены арганізатары для скліканьня батракоў на перавыбарчыя і выбарчыя сходы. Вылучана 10 чалавек са складу праўленьня для праверкі падрыхтоўкі на мясцох да выбарчай кампаніі.

Саюз будаўнікоў вылучыў арганізатара для правядзеньня кампаніі ў сялішчах, заселеных будаўнікамі. Вызелена брыгада ў складзе 8 чалавек для арганізацыйнай працы і ўдзелу ў гэтай кампаніі.

Мясцкомы саюзу санітарнаслужачых, саюзу працасьветы прымацоўваюць многіх членаў сваіх калектываў да таго ці іншага сялішча акругі для актыўнага ўдзелу ў перавыбарчай кампаніі. Саюз мэдсанпрацаўнікоў зьвярнуўся з лістом да ўсіх членаў саюзу аб актыўным удзеле ў перавыбарах саветаў.

Аднак некаторыя саюзныя арганізацыі яшчэ не распачалі падрыхтоўкі да праведзеньня перавыбарчай кампаніі. Напрыклад, саюз працаўнікоў мастацтва яшчэ нічога не зрабіў для правядзеньня гэтай кампаніі. Саюз транспартнікаў яшчэ не раскачаўся і г. д. Але ня глядзячы на гэта, напружаньнем усіх сіл, памятаючы асноўную лінію нашае партыі, мы сёлета з задачамі перавыбарчай кампаніі справімся добра.

АРГАНІЗАВАЛІ НОВЫЯ 2 КАЛГАСЫ.

(Ляднянскі с.-с., Аршаншчына).

У 1928 годзе ў в. Пацэнках праводзілася земляўпарадкаваньне. Вёска складаецца з 50-ці двароў, у большасьці бядняцкіх. Пры арганізацыі земляўпарадкаваньня 18 двароў з'арганізаваліся ў 2 калгасы, рэшта арганізавалі пасёлкі і некаторыя выйшлі на хутары. Калгасы ўжо зараз маюць станоўчыя вынікі ў сваёй працы. Калгас «Новае Жыцьцё» ўвосень пасадзіў на 4 дзесяцінах сад. Атрыманы крэдыты для набыцьця жывёлы і лесаматар'ялу для пабудовы будынкаў.

Не адстаюць калектывы і ў культурна-выхаваўчай працы. Арганізаваны с.-г. гурток, якім кіруе аграванмія. Выпісваюць калектыўна газэту.

Калгасы калектыўна падпісаліся на 2-ю пазыку індустрыялізацыі на 60 р.

Пры земляўпарадкаваньні зямля разьбіта на шматпольле, і калгасы ў веснавую пасэўную кампанію мяркуюць ужо перайсьці на грамадзкую апрацоўку зямлі.

Але недахопам можна лічыць тое, што мала даецца крэдытаў для набыцьця розных машын і прылад.

Трэба дапамагчы калгасам у іх працы.

Б. Д.

Загадчык школы—антысэміт.

Магілеў, 17-XII. Калі да загадчыка Княжыцкае школы сялянскае моладзі гр. Пяроўскага зьвярнуўся за разьлікам бедны саматужнік—Ёсель Малочнікаў—гроўны загадчык узяў Малочнікава за карак і спусьціў са сходаў школьнага будынку, крычачы, і паліцася антысэміцкая лаянка.

— Вон...

— Каб і паху твайго ня было тутака!!

Тав. Малочнікаў працаваў у школе на ачыстцы пячных дымаходаў, зараблі нейкія там капейкі, але ня здолеў атрымаць і іх...

Прышоўшы ў другі раз да Пяроўскага, Малочнікаў, зачест грошай, зноў пачуў лаянку, вывіўшую загадчыка, як злоснага антысэміта і чорнасоценца.

Насельніцтва Княжыц падта абурана гэткімі контр рэвалюцыйнымі выбрыкамі Пяроўскага.

Сорам яму, як савецкаму настаўніку-выхаваўцу!..

Хай глянае ў Княжыцкую школу акруговы інспэктарыят асьветы! Юр.

ЗАМЕСТ ЗВАЛЬНЕНЬНЯ З ПАСАДЫ---ПАВЫШЭНЬНЕ.

Бярэзінскі райён багаты лясамі, але багацьце гэта з году на год памяншаецца, дзякуючы толькі таму, што ахова лясоў як дзяржаўнага, так і мясцовага значэньня знаходзіцца ў кепскіх умовах, а часамі і таму, што асобы, якія кіруюць лясной гаспадаркай, нядбайна і нясумленна выконваюць тыя абавязкі, якія на іх усклады.

Для прыкладу возьмем Пагоскае лясьніцтва; там на паперы ўсё абстаіць нібы добра, лес так ахоўваецца, што лесьнікі, у абходах якіх заўважаны значныя самаўласныя пасечкі замест звальненьня з пасад атрымліваюць вышэйшыя пасады—«аб'ездчыкаў».

Міхась Булойчык доўгі час займаў пасаду лясьніка абхода № 9, але абход яго на пекалькі сот каштоўных дрэў парадзеў—ён зусім ня цікавіўся аховай лесу, атрымліваў акуратна пэнсію, карыстаўся сенажацьцю і службовым надзелам, а лясьніцтва яму давярала і ніколі не правярала. Булойчык заўсёды хвастаўся ў канцэляры лясьнічага, што ў абходзе № 9 самаўласных пасечак няма і справа аховы лесу абстаіць добра.

Вядома, што за сумленную працу бываюць і павышэньні пасадай. Булойчык, дзякуючы свайму языку, з лясьніка зрабіўся аб'ездчыкам і перадаў свой абход № 9 увоў прызначанаму лясьніку—Палякову.

У перадатачным акце абходу Булойчык напісаў, што за два гады адбылося толькі 27 пасечак, але і тыя закасаваны штрафным кляймом.

На другі і трэці дзень лясьнік Палякоў абышоў прыняты на сумленнасьць абход і заўважыў значныя пасечкі лесу, аб чым і даклаў Булойчыку, як аб'ездчыку.

Булойчык прыехаў у лес і штрафным кляймом адбіў усе пасечкі, якія адбыліся за час яго службы і гэткім чынам захаваў сьляды свайго нядбайства, якое каштавала дзяржаве і лясной гаспадарцы на суму звыш 500 р.

Вядома, калі падобныя Булойчыкі замест крымінальнай адказнасьці будуць павышацца ў пасадах, лясом не паздаровіцца, а калі Пагоскае лясьніцтва, ня ведаўшы броду будзе саваць ў воду, дык напэўна ўтопіцца і прыдзецца цягнуць за вушка лясных бюракратаў і галавацяпаў.

Гай.

Кулацкая расправа.

(Па тэлефону ад барысаўскага карэспандэнта).

Старшыня Веляцкага сельсавету пасьля правядзеньня сходу беднаты ў в. Сморкі аб пераходзе яе на калектыўную апрацоўку зямлі, варочаўся дамоў. Кулакі гэтае вёскі ў ліку 4-х чалавек схапілі старшыню т. Палкаўца і ўкінулі яго ў студню. Праз 20 хвілін яго адтуль выцягнулі сяляне, якія прышлі па ваду і ўбачылі яго там.

Палкавец цяжка паранен.

„Даўно ня бачылі агранома".

(В. Ірвяніца, Ляднянскі р., Аршаншчына).

У в. Ірвяніцы налічваецца 70 сялянскіх двароў, якія трымаюць буйную жывёлу: каровы, коні і дробную, як оўцы, сьвіньні і інш.

Уся жывёла ня вельмі добрая, а ў большасьці кепская, а каб палепшыць становішча сялянства—трэба паклапаціцца райёнаму аграному т. Барадулі, які віводзіць разу не заглянуў у вёску Ірвяніцы, Баеўскага с.-с.

Сяляне гэтае вёскі былі-б вельмі задаволены, каб аграном ім расказаў, як заводзіць лепшую жывёлу, як яе карміць, хлеў ацяплець, а гэтага няма. Трэба райёнаму аграному разам з старшынёю РайЗА т. Кажоўнікавым заглянуць у вёску Ірвяніцы і арганізаваць сельска-гаспадарчы гурток. Таксама мала сяляне сартуюць збожжа, а для гэтага трэба правесьці гутарку з сялянамі т. Барадулю.

Я. С. Крючкоў.

Каапэравана 2530 бядняцкіх гаспадарак.

(Полаччына).

Па сыстэме сельска-гаспадарчай каапэрацыі Полаччыны на першае кастрычніка 1927 году было каапэравана бядняцкім фондам 574 гаспадаркі на суму 1046 рублёў. Засталося нескарыстанымі—622 рублі.

На першага кастрычніка бягучага году каапэравана 2530 гаспадарак на суму 11303 р. Засталося нескарыстованы 775 р., што тлумачыцца нядбалымі адносінамі сельскампомаў у справе прадстаўленьня сяльскай беднаты крэдытным таварыствам.

Ан. П.

Абсталяваньне для заводу „Сельхарчпрам".

Гомель, 17-XII. Атрымана з-за межаў, для садавіна-гароднінага заводу «Сельхарчпрам» сушыльная машына «Беннашмідта» вытворчасьцю да 1638 тон сыравіны ў сэзон.

Апроч таго, у бліжэйшы час чакаецца наступленьне з-за межаў іншага абсталяваньня для нанова будуемага крахмальна-патачнага заводу. Садавіна-гароднінны завод па свайму тэхнічнаму абсталяваньню будзе першым у СССР.

БОЛЬНІЦА ДЛЯ ХВОРЫХ НА СУХОТЫ.

Гомель, 16 XII. У Гомелі будзе пабудавана больніца для хворых на сухоты. Асобная камісія ўжо выбрала месца.

«Чырвоны Крыж» намячае арганізаваць у Гомелі хірургічную і гінекалёгічную больніцы.

ПАШЫРЭНЬНЕ МЭБЛЕВАЙ МАЙСТЭРНІ.

Рэчыца, 17-XII. У апошні час павялічыўся попыт на мэблю. Для задаваленьня попыту пашырана сталярна-мэблевая майстэрня.

На працу назначана яшчэ 10 чал. Паліроваўны цэх перайшоў на працу у 2 зьмены.

10 год Ленінскага Камсамолу Беларусі.

НА ПЕРШЫМ ПЕРАВАЛЕ Ў ДРУГОЕ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЕ.

(На ўрачыстым сходзе ў Белдзяржтэатры).

Сёньня Ленінскаму Камсамолу Беларусі дзесяць год.

За гэты кароткі кавалак гісторыі, за гэтыя дзесяць вёсен і зім—перажыта болей, чым іншымі пакаленьнямі за стагодзьдзі.

Са сцэны Беларускага Дзяржаўнага Тэатру, упрыгожанай чырвонымі сьцягамі, сёньня вее бадзёрасьцю, камсамольскім запалам, вясной.

З кароткіх слоў—прывітаньняў т. т. Гамарніка, Галадзеда, Галавача і іншых таварышоў—паўстае агульны малюнак барацьбы і змаганьня за лепшую будучыню дзесяткаў тысяч камсамольцаў Беларусі.

Успамінаюцца поўныя гераічнага эпосу гады рэвалюцыі—17-18-19-20 г. г. Толькі ў такой завірусе, толькі ў такой барацьбе двух супроцьлеглых клясаў магла нарадзіцца такая рэвалюцыйная баявая арганізацыя, як Камсамол.

Без індывідуальных «я», бяз хістаньняў, з цьвярозай марксыцкай развагай, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, а часам па інстыктыўнаму клясаваму пачуцьцю змагалася лепшая частка энэргічнага маладняка на вулічных барыкадах, на многалікіх франтох грамадзянскай вайны.

Многа таварышоў загінула ў гэтай барацьбе ў глухіх беларускіх пушчах, на неабсяжных прасторах палёў, у багавіньні легендарных балот, а пагэтаму сёньня ўставаньнем ушаноўвае іх памяць актыў менскага камсамолу.

Ад вінтоўкі, ад «Босых на вогнішчы», камсамол перайшоў да спакойнай працы па будаўніцтву сацыялізму.

Кажучы славамі паэты.—

«Адгрымелі вялікія годы,
Гніль старую загнаўшы ў труну,
Сёньня мы па палёх, па заводах
Абвясьцілі другую вайну!
Тут няма ні крыві, ні трывогі
Кліч вазіцы—„будуй, тварыі"
Кожны мэтр пераналю—перамога,
Сотня кожная цаглы—прарыў!.."

Васьмідзесяцітысячная арм'я камсамолу Беларусі—на франтох гаспадарчага будаўніцтва маладой рэспублікі. Рацыяналізацыя вытворчасьці, дзесяткі соцен вынаходцтваў камсамольскага маладняка—у горадзе і будаўніцтва новых калгасаў, перавод сельскае гаспадаркі на сацыялістычныя рэйкі—ў вёсцы—вось сёньняшняя праца камсамолу.

У нас яшчэ шмат старога, мяшчанскага; мы яшчэ робім занадта многа памылак; не заўсёды даём належны адпор наступу клясавага ворага. Але ўсё такі, усё-такі

„І пакуль на адзіным полі
Не пасходзяцца ўсе рубяжы,
Будзе першым ісьці камсамолец,
Будзе арміі ленінцаў жыць!.."

Цім. ЗАРЭЧНЫ.

ПАЧАЛІСЯ СПРАВАЗДАЧНЫЯ СХОДЫ

Праца гарсавету---пад абстрэлам рабочых.

БАРЫСАЎСКІ ГАРСАВЕТ НЯ ВЫКАНАЎ ШЭРАГУ ПРАПАНОЎ РАБОЧЫХ, ДАДЗЕНЫХ ЯМУ Ў ЛЕТАШНІМ ГОДЗЕ

На ўсіх прадпрыемствах і ўстановах гарсавет робіць справаздачу перад насельніцтвам. У гэтым годзе нагадваецца вялікая зацікаўленасьць з боку насельніцтва ў вылучэньні ўсіх хворых зьявішчаў у яго працы.

Сходы цягнуцца да глыбокае ночы. Рабочыя пасьля дакладу задаюць розныя пытаньні прадстаўніком гарсавету, і патрабуюць гэтыя недахопы зьнічыць. Праўду сказаць, што ў гэтым годзе ў працы гарсавету ёсьць значныя дасягненьні, ёсьць чым пахваліцца, але ёсьць шэраг прапаноў з боку рабочых яшчэ ў леташнім годзе, якія гарсавет ня здолеў выканаць да сучаснага моманту.

Вось прапановы рабочых, якія засталіся толькі на паперы Барысаўскага гарсавету. Яшчэ ў леташнім годзе рабочыя прасілі аб асьвятленьні цёмных вуліц акраін гораду, дзе пануе хуліганства і забойства, аднак гэтая прапанова засталася толькі прапановаю, якую гарсавет яшчэ абяцае выканаць. Ёсьць шмат вуліц, дзе ня толькі нельга праехаць, але і прайсьці. Працаўнікі гарсавету адказваюць, што Барысаў пабудован на балоце, аднак трэба сказаць, што людзі ў балоце ня жывуць і гэта зусім ня так.

Калі вы заглянеце да нас у Барысаў, дык убачыце, што побач з памяшканьнем гарсавету ў самым цэнтры гораду гарсавет пабудаваў свотны двор. Хто скажа, што кепска жывецца грамадзянам Барысава, тут ня жыцьцё, а рай. Недарма жыхары б'юць трывогу з просьбаю пазбавіць іх такога «раздольнага» жыцьця.

Тут-жа побач в гарсаветам існуюць дзьве піўныя, ня жыцьцё, а малінка. Гэтыя памяшканьні напамінаюць «буйныя парыскія рэстараны». Дзікія песьні і гарэлка ліюцца ракою. Звоя бутэлек, хуліганства, бойкі і г. д.

На лепш справа стаіць з мэдапамогаю. Хочаш атрымаць дапамогу, дык лепш загадзя кладзіся і памірай. Прыходзіцца дням абівацца парогі амбулаторыі і толькі тады атрымаеш дапамогу. Асабліва рабочыя скардзяцца на чыста габінэтную працу дактароў па зубных хваробах. Калі паставіць на зуб плёмбу, дык трэба кожны тыдзень хадзіць, каб яе перамяніць. Кепска стаіць справа з лазьняй, палова рабочых застаецца без яе. Гарсавет і да гэтага часу ўсё яе рамантуе. У лазьні не хапае вады і г. д.

Праца з дэлегаткамі праводзілася нездавальняюча. Калі дэлегаткі зьбіраліся на сход, дык сэкратар сэкцыі Мацеўская адказвае, што вы яшчэ не падрыхтаваны і толькі ходзіце бузіць. Зусім малы ўдзел прымаў гарсавет у васьвізацыі.

Ёсьць некаторыя дасягненьні, напр., пабудавана новая больніца. Па пляцу Валадарскага пабудавана вадаправодная вежа, якая будзе дастаўляць насельніцтву Барысава добрую ваду. Адрамантаваны і часткова забруківаны шэраг вуліц і кватэр і г. д. Наогул трэба сказаць, што гарсавет параўнаўча з мінулымі гадамі зрабіў вялікі крок наперад у сваіх дасьгненьнях, але ёсьць і шэраг недахопаў, якія трэба хутка зьнічыць.

А. Станкевіч.

АБГАВАРВАЕМ ПРАЦУ ГАРСАВЕТУ.

На сходзе знаходзяцца сябры трох саюзаў: харчавікі, будаўнікі і рабзмлесаўцы. Стаяла справаздача гарадзкога савету за два гады сваёй працы. Спрэчкі, ня гледзячы на невялікую актыўнасьць, выкрылі наступныя недахопы ў працы гарсавету:

— Кепска астаіць справа,—кажа адзін з сяброў—з рамонтам" камгасскіх дамоў. Рамантуюцца толькі тыя, якія знаходзяцца каля цэнтральных вуліц, а на акраінах гораду дамы разваліваюцца, дзякуючы недагляду.

Кепска працуе пажарная дружына. Гэта можна бачыць і з апошняга пажару, калі дружына прыехала з вялікім спазьненьнем. Пажарная дружына кепска працуе з-за таго, што склад яе па сац. становішчу дрэнны. Ёсьць гандляры і інш.

Кепска абстаіць справа з раздзелам пляцоў. Давалі апошнія таму, хто атрымаў высялак ня ў межах гораду. Былі і такія моманты, што працаўнікі бяз бутэлькі «рускай горкай» ня йшлі мераць зямлю.

Гарсавет ня прымаў ніякіх мер для таго, каб зроблены былі ўплывы на пастухоў, хаця аб гэтым і напаміналася з боку саюзу рабземлесу.

Сябры саюзу, асабліва абраныя ў гарсавет, у працы не дапамагалі. Былі і такія выпадкі, калі сябры гарсавету ні разу ня былі на пасяджэньні. Халатнасьць, нядбайныя адносіны з іх боку праяўляліся часта.

Санітарная камісія, якая існавала пры гарсавеце, на працы сябе не апраўдала.

Праца каапэратыўнай камісіі таксама кульгала, а астатнія, так-сяк працавалі.

Ня гледзячы на тое, што на сходы былі арганізаваныя сябры саюзу, сход прайшоў надзвычайна дрэнна.

На сход павінна было зьявіцца ка. 300 чалавек, а зьявілася 115 чалавек. Пад канец сходу ў залі засталося чалавек 80, якія і прымалі рэзалюцыю аб далейшай працы без галасаваньня. Старшыня сходу, пасьля таго, як была прачытана рэзалюцыя, спытаў:—Хто мае што-небудзь з зьменаў, альбо дадаткаў да рэзалюцыі?

Усе маўчаць.—Значыць згодны?..—Згодны. На гэтым сход і зачыніўся.

Арганізаваная маса так безадказна да важнай кампаніі адносіцца не павінна.

М. Процька.

КОНКУРС-ПЕРАКЛІЧКА КУЛЬТАСЬВЕТНЫХ УСТАНОЎ.

(Ліст з Гомелю).

Для праверкі працы культурных устаноў вёскі, іх удзелу ў правядзеньні перавыбарчай кампаніі саветаў акруговая выбарчая камісія і акрпалітасветы з 20 сьнежня па 1-е лютага праводзяць конкурс-пераклічку на лепшы арганізаваны ўдзел культурных устаноў у вёсцы ў правядзеньні гэтай кампаніі.

У конкурсе прымаюць удзел: нардамы, хаты-чытальні, бібліятэкі, чырвоныя куткі, лікпункты і інш. культустановы. Хаты-чытальні, нардамы, бібліятэкі і інш. атрымоўваюць 3 прэміі: 1-я прэмія—поўную радыё-устаноўку, 2—швэйная машына, 3—насьценны гадзіньнік і 5 прэмій атрымліваюць кіраўнікі гэтых устаноў: 1 прэмія—адна навуковая экскурсія ў Маскву, 2—малы энцыклёпедычны слоўнік, 3—аплата 2 працаўнікам за заочныя курсы інстытуту палітасьветпрацы і абор твораў Леніна на беларускай мове.

Сялянскія школы для дарослых, школы сялянскай моладзі за правядзеньне тых-жа мерапрыемстваў у кампаніі перавыбараў саветаў таксама атрымаюць 3 прэміі: поўнасьцю абсталяваны вайсковы куток, поўны абор твораў Леніна на беларускай мове і камплект дыяграм па выбару школ.

Апроч таго, вызначаны 10 прэмій для лікпунктаў, 7 прэмій для школ павышанага тыпу, 15 прэмій для селькораў.

Конкурсная камісія арганізавана ў складзе: прадстаўніка акрвыканкому т. Амбражуняса, рэдактара «Полесской Правды» Рычкова, рэдактара «Беларускай Вёскі» т. Шукевіча-Трацьцякова і іншых прадстаўнікоў.

Н. В.

ПАЛІТЫКА БІЗУНА І ПЕРНІКА.

Французкі шавінізм ужо здаўна марыць аб граніцы да Рэйна, ужо здаўна марыць аб тым, каб граніцай паміж Францыяй і Нямеччынай была рака Рэйн, іншымі словамі, каб багатыя правінцыі Рэйнскае вобласьці адышлі да Францыі.

Вось чаму правы бок заўзятых французкіх шавіністаў, тыя, хто марыў скончыць імпэрыялістычную вайну трыумфальнай працэсіяй па вуліцах Бэрліну, былі нездаволены нават і вэрсальскім мірным дагаворам, які у меншай ступені адабраў у іх надзеі на яшчэ большае зьняважаньне пераможанай Нямеччыны.

Тады супроць гэтых шырокіх плянаў французкіх шавіністаў паўсталі іншыя іх саюзьнікі і галоўным чынам Англія, якая баіцца вельмі значнага ўзмацненьня французкага імпэрыялізму на кантыненце.

Так ці інакш Францыя разам з Англіяй і Бельгіяй атрымалі права акупаваць рэйнскія правінцыі на 15 год, прычым тэрмін гэтай акупацыі на ставіўся ў залежнасьць ад выкананьня нямецкай рэспублікай яе фінансавых абавязацельстваў, навязаных ёй вэрсальскім дагаворам.

Акупаваўшы рэйнскія правінцыі, імпэрыялістычная Францыя ўсімі сіламі імкнецца працягнуць тэрмін гэтай акупацыі, наперашае, таму, што яна ўпотайку спадзяецца як-небудзь так зрабіць, каб застацца там назаўсёды і, падругое, яшчэ таму, што яна ня хоча выпускаць з сваіх рук гэткага дасканалага сродку націску на Нямеччыну, якім зьяўляюцца ў яе руках акупаваныя рэйнскія вобласьці.

Зразумела, такая доўгая акупацыя краіны вайсковаю сілаю чужаземнае дзяржавы з усімі зьвязанымі з гэтай акупацыяй зьявамі і абмежаваньнямі ня можа спадабацца ня толькі нямецкаму імпэрыялізму, але ўсяму нямецкаму народу наогул.

Апроч чыста нацыяналістычнага пачуцьця, закранутага гэтай доўгаслоўнай акупацыяй, нямецкай буржуазеі не падабаецца яна і таму, што прысутнасьць чужаземнага войска, чужаземных устаноў і чыноўнікаў не дае ёй магчымасьці эксплёатаваць у сваіх інтарэсах вялікія багацьці краіны. Што-ж датычыцца рабочай клясы Рэйнскіх вобласьцяў, дык і ёй ня можа асабліва падабацца гэта доўгачасовая акупацыя, бо, дзякуючы ёй, яна адчувае на сваёй сьпіне зьдзекі і эксплёатацыю з двух бакоў: свайго ўласнага капіталізму і французкай ваеншчыны.

Наколькі ў гэтым пытаньні думка нямецкай грамадзкасьці аднадушна, наколькі акупацыя Рэйнскай вобласьці зьяўляецца для іх балючым і вострым пытаньнем, можна бачыць па зьместу тэй прамовы, якая была зроблена нямецкім рэйхсканцлерам Германам Мюльлерам на прыёме, налад

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

КРЫЧАЎСКІЯ ТРАДЫЦЫІ.

М-ка Крычаў—выдатны ў старажытныя часы горад, і ў сучасны момант не зьяўляецца апошнім месцам на тэрыторыі БССР. Там будуецца чыгунка, зялізары мост праз раку Сож. У м-ку ёсьць помнікі старасьветчыны. Гэты горад пабудован на раце Кравачаўцы і мае ўзорны выгляд з боку рэкі Сожа, над крутым берагам якога красуюцца ў перамежку старых з новымі хаткі і «домікі» сялян. Старажытнасьць Крычава добра зьвязана з сучаснасьцю: спакон вякоў ў Крычаве ў год бывае 2-3 пажары, а то й да 10-ку.

Злыя падта былі ў гэтым гарадку і паліцэйскія, асабліва ўрадзікі. Не лепш і на старшынь. Пра аднаго старшыню расказываюць і цяперака: «Як только прыдзе да яго, бывала, селянін, дык ён ня выслухоўваў, а адразу пачынаў: «Што ты мне вязьдза гнеш? Агулым гурт! Хурмальны хват —Пасадзіць!. Баяліся яго настаўнікі і ўсе, усе, асабліва жонка яго' якую ён пасадзіў у «каталажку» за тое, што яна не назвала яго ў прысутнасьці іншых—гаспадзін старшыня». Старажытнасьць і тут зьвязана з сучаснасьцю.

Надаўначуды прызначан інспэктарам на нарасьвеце гр. Хацяноўскі. Настаўнікі-бацюшку інспэктару:—«чалом б'ём Вашае міласьцю цэлай канфэрэнцыяй. Нам РВК ня плоціць грошай за прыгусовыя пераводы, згодна калектыўнага дагавору і статуту. Грошыкі мы свае трацім—40-42 рублі на пераезд.

Адказаў ім інспэктар—«агулам гурт»

— Дзяржава наша бедная і ня можам рабіць лішніх выдаткаў, бо ня прадугледжаных законам, а Вы, настаў нікі-сацыялісты, не павінны скардзіцца.

Настаўнік Маскалевіч забыўся, што ў інспэктара ёсьць жонка.

Настаўнік сьмела выступіў і кажа:

— ты ж камуністы, але не шкадуеш дзяржавы — сам атрымліваеш 80, ды жонка 70, і калі сюды праехаў 20-30 кілёмэтраў, дык і то атрымаў з гаспадарчых сродкаў Малятыцкай школы 60 рублёў пад'ёмных.

Можа і прайшло-б, але настаўнік гэты мабыць і жартаваць любіць:

— Бачыце, які ён «Кузьма бесьсярэбраньвік»,—дадае ён у канцы.

Едзе час. Інспэктар з жонкай абляпаў за «бессярэбраньніка».

Кончыліся заняткі ў школах 15 верасня. Інспэктар падае заяву ў 7-ку не паступаць; не, а просіць часова завяць сабе пад кватэру інтэрнат школы да 1-га верасьня. Загадчык школай маладзец: узяў расьпіску, што з 1-га верасьня хоць і начальнік, але з кватэры-інтэрнату—выхадзі.

Справа проста робіцца.

Настаўніку за „Кузьму бесьсярэбраньніка адносьнік ад камгасу РВК № 5251 ад 18 9: «Згодна заявы загадчыка школы, Вамі да гэтага часу яшчэ не аслабжована кватэра пад інтэрнат школы. А пагэтаму Крычаўскі РВК ў другі раз напамінае Вам аслабаніць кватэру к 18-9 г-г. У працівным выпадку памяшканьне будзе аслабонена праз міліцыю. Заг. камгасу (начытальна); дославод (начытольна)».

А каб была справа чыста—

настаўніка «за Кузьму» пераводзяць з гэтай школы ў іншую, праўда, тутака ў Крычаве, але ён, такім чынам, траціць і кватэру пад інтэрнат, а інтэрнат адыходзіць пад кватэру інспэктара. Добрая кватэра! Ёсьць катны, на рамонт гэтых паколаў пад інтэрнат затрачана ў 25 годзе да 250 руб.

А каб зусім было гладка—

на месца настаўніка Маскалевіча прызначаюць настаўніну,—жонку заг. мясцовай поштай, які мае ўласны дом.

Ня прышлі да згоды.

Мясцком не згадзіўся на перавод Маскалевіча. Вызначаная мясцкомам і РВК канфліктная камісія да згоды ня прышла.

Справа ў акруговым саюзе працасьветы.

Саюз працасьветы перадае справу прэзыдыуму АВК, і апошні скасаваў пастанову Крычаўскага АВК.

І пашла пісаць...

РВК прапануе Хацяноўскаму даць больш грунтоўныя матывы да пераводу. Тут-жа прызначаюць, дзеля палепшаньня матар'яльнага становішча, у 7-ку яшчэ настаўніка на 6 гадзін, але прыходзячага. Нова-назначаныя настаўнікі не ўзялі выкладаць прадмет Маскалевіча, і школьная рада даручыла 6 лекцый эканомгеаграфіі іншаму настаўніку.

Жонка інспэктара прызначана ў 7-годку.

У школе досыць было матэматыкаў, ма'быць, непрыгодных? Гэта справа іншая, але-ж яна заявіла:

— Я маю вышэйшую матэматычную адукацыю, вазьму сабе выключна лекцыі матэматыкі ў другіх канцэнтры.

„Жонка інспэктара"... Лекцыі ўжо былі разьмяркованы, але—было ня было... здаволілі... Нажаль, дакумэнтаў аб «матэматычнай» „вышэйшай" не аказалася. «Хваля рэвалюцыі захапіла іх у Маскве»... Адным словам, „справа ў шляпе". Хацяноўская, жонка інспэктара, мае кватэру і пенсіі 109 рублёў. Ма'быць за кватэру ня плаціць

Забыўся настаўнік Маскалевіч, што язык на дадзен дзеля таго, каб гаварыць, а каб укела яго трымаць за зубамі.

Самакрытыка тут вінавата, а не Маскалевіч.

Справа блізіцца да канца.

ПК РСІ пацьвердзіла пастанову АВК аб тым, што настаўнік Маскалевіч павінен застацца ў Крычаўскай сямігодцы, а інспэктара Хацяноўскага вырашана зьняць з працы. Магілеўскай акруговай РСІ—дасьледаваць і вырашыць канчаткова справу на месцы.

ВАШЧЫЛА.

ПРОСТА СТРАХ БЯРЭ.

(Лагойскі р., Мокшчына).

Далікатныя людзі працуюць у грашовай частцы Лагойскага РВК: як, куды, дзе, што якое, ды аб чым паведаміць трэба, дык усё чысьценька прадугледзіць, каб на месцы ня падта разважалі,—ды думалі над іншымі адносінамі. Толькі—падта-ж ужо ён—тая сур'ёзныя,—аж настаўнікаў іншы раз пужаюць.

Атрымае каторы, напрыклад, аваес на гаспадарчыя выдаткі школы, а тут ужо «эстафэта» ўсьлед, ды не абы якая, а «вельмі тэрміновая» аб тым, што: „фінчастка катэгарычна прапануе на атрыманьні гэтага зараз-жа прадставіць справаздачы за ўзятыя аваесах, не чакаючы іх поўнага выдадзіваньня, у іншым выпадку заказычанасьць будзе пакрыта вашай пэнсіяй і апрача таго, за невыканаьне гэтага,—будуць прыняты і вам адміністрацыйныя крокі ўзысканьня".

Згодна адносіны грам. часткі Лагойскага РВК (№ 9183), ня толькі без пэнсіі застанешся,—але і ў пайшчыкі „ДОПР'у", —трапіш.

Загадчык грашовай частки, відаць, чалавек сур'ёзны, жартаў ня любіць, а блякі авансавых справаздач маюцца толькі ў грам.-частцы, а бяз іх рахункаў ня прымаюць. А да грашовай частки—25 вёрст, фурманка каштуе 5 руб. (настаўніцкім 42-ух руб. бюджэтам не прадугледжана).

Справаздачу трэба «зараз-жа», блякаў няма.

Ці ня можна гэта, тав. заг. грашовай частки, прыхы ня гэтак сур'ёзна. Відома, старыя настаўнікі, дык ужо прызвычаіліся да гэткіх „адносін—вазамінкаў", але як настаўніку першы год працуючому (а гэткіх у нас шмат), дык вельмі ужо падта страшна робіцца.

Стары настаўнік.

„НАД ЛИЧНОСТЬЮ НАЧАЛЬСТВА НЕ ПРИЗНАЮ".

(Рагачоўскі р., Бабруйшчына).

Так кажа настаўніца Юдзіцкай школы, Рагачэўскага райёну, Гушча. Што хачу, тое і раблю; хачу з хлопцамі піць самагон—буду піць, хачу вылаяць каго—вылаю, захачу на кірмаш куды паехаць, а на школу замок павесіць—ну, і паеду, каму-ж што да гэтага,—гэта-ж мая асабістая справа. І п'янствуе, і лаецца, і зачыняе школу, і разьязджае па кірмашох.

У школе працуе як ведае, і як ёй узумаецца. А як яна працуе, можна даведацца з яе ўласных слоў. Калі ў яе запыталіся, чаму яна ў працягу двух гадоў віразу ня была на райённых настаўніцкіх сходах, дык яна адказала: «Не езжу потому, что ничего не понимаю, о чем там говорят». І на канфэрэнцыі ня езьдзіць, і на падрайённыя гурткі ня ходзіць і наогул нічога не прызнае. Калі інспэктарыят перадаў увесь гэты матар'ял на расьсьледваньне і калі ўсё гэта пацьвердзілася, было пастаўлена пытаньне перад райвясцкомам працаўнікоў асьветы аб зьняцьці Гушчы з працы, але апошні на гэта згоды ня даў. Справа разглядалася ў акруговай інспэкцыі працы, там таксама прызналі, што гэта—справа Гушчы, і школы ня тычыцца.

Гушча працуе ў школе паранейшаму, робіць усё тое, што ліча «своим личным делом», а сяляне, бачачы гэтыя «асабістыя справы» і шкадуючы сваіх дзяцей, зноў пішуць сьлёзныя скаргі ў інспэктарыят.

Песьня, мабыць, зноў пачнецца спачатку і невядома калі яна скончыцца.

В.

ЗА МАРДАБОЙСТВА ВУЧНЯЎ---ДАЛОЎ З ПРАЦЫ.

(Круглянскі райён, Аршаншчына).

Настаўніца Дарошкавіцкай школы Круглянскага райёну, Аршанскай акругі Шчарбакова займалася з першай і другой клясай. Займацца з малымі дзяцьмі ды яшчэ з дзьвюма групамі, бязумоўна, цяжка, і Шчарбакова, папоўская дачка, ня маючы педагагічнага такту, каб стрымаць вольнасьць вясковай дзетвары, пускае ўход мардабойства.

16 кастрычніка г. г. у прысутнасьці сябра сельсавету прышоў вучань Шабусаў Міхась і заявіў, што пяць дзён таму назад настаўніца Шчарбакова яго набіла —драла за вушы і біла па твары, так што ў яго некалькі часу балела галава.

Загадчыцца гэтае школы Шкапцова нават пачырванела. Яна ні разу ня чула ад вучняў, каб яны скардзіліся, што іх хто небудзь б'е.

Прышлося зрабіць апытаньне вучняў, якія паказалі наступнае: 10 кастрычніка за тое, што вучань Шабусаў М. жартуючы ўдарыў свайго таварыша Копіка П. ручкай, Шчарбакова схапіла яго за вуха ды аб скамейку лбом, а потым адхлястала па твары.

На запытаньне, ці біла настаўніца іх яшчэ калі-небудзь, яны адказалі:

У мінулым годзе біла ўсіх і ўсяк: аб дошку лбом, аб шафу, ручкай ад нажа па лбу, па твары далонью і драла за вушы.

Чаму-ж вучні маўчалі і не казалі нічога загадчыцы школы Шкапцовай? А справа ў тым, што Шчарбакова напужала вучняў так, што тыя сядзелі як мухі ў шчыліне.

— Калі я даведаюся, што хто-небудзь з вас да расскажа аб гэтым дома, або загадчыцы, дык задам утрая, —казала яна, і вучні вымушаны былі маўчаць.

Спачатку Шчарбакова адмаўлялася ад сваіх праступкаў, але потым, калі гэта было пацьверджана вучнямі, яна адказала:

— Хачу, дык і б'ю, ня ваша справа.

Вось як настаўніца Шчарбакова распраўлялася з вучнямі. Цяпер пагляд зін яе адносіны наогул да сваіх абавязкаў.

Без усялякага ведама загадчыцы школы і школьнае рады т. Шчарбакова прымала вучняў у школу, уносячы такім чынам бясплатнавасьць у прыёме. Прымала ў школу заможную частку, а бядняцкія дзеці з-за недахопу месц заставаліся за бартом школы. Назіраліся частыя пропускі т. Шчарбаковай лекцый на 25 проц. бяз уважлівых прычын, як устаноўлена камісіяй на расьсьледваньню гэтае справы.

На пасяджэньні школьнай рады не зьяўлялася, лічачы гэта лішнім і непатрэбным.

Ніякай выхаваўчай працы сярод вучняў яна не праводзіла, з прычыны чаго вучні ходзяць на ігрышчы і гуляюць у карты.

Разам з гэтым нельга хваліць і загадчыцу школы т. Шкапцову. У школьную раду ўведзен селянін, які пазбаўлен права голасу. На абгаварэньне школьнай рады ні разу ня ставілася пытаньне аб выхаваўчай працы настаўніцы Шчарбаковай, аб яе паводзінах як у школе, так і па-за школай. Тав. Шкапцова ні разу, як загадчыца школы, не пацікавілася набыць на лекцыях у Шчарбаковай.

Настаўніцу Шчарбакову пастаноўлена з працы зьняць. Міхайла.

Становішча школ дрэннае.

Калінкавіцкі РВК (Мазырышчына) ня даў яшчэ ніводнай капейкі на гаспадарчыя патрэбы школ. У некаторых школах вокны разьбіты, сьцены не пабелены, класы не прыбіраюцца, бо ўборшчыкаў няма і грошы на ўборку памяшканьняў не адпускаюцца. Калі настаўнікі зварочваюцца за грашыма ў РВК, дык ён адсылае ў сельсавет, а ў сельсавеце кажуць, што РВК загадаў грошы на капейкі не даваць.

Настаўнік.

АСЬВЕТНІЦКАЯ ХРОНІКА.

КАЛДАГАВОРНАЯ КАМПАНІЯ.

Зараз на саюзу працасьветы праводзіцца кампанія на пераключэньню калектыўных дагавораў. Асабліва увага зьвернута на ўпятнаньню ў абгаварэньне калдагавору асьветніцкіх мас на райёнах. Праэкт калдагавору абгаварваецца на нарадах, агульных сходах, на сходах прафактыву і г. д. Кампанія па заключэньню новага калдагавору ў асноўным павінна быць скончана да 1 студзеня.

СПРАШЧЭНЬНЕ ЎСТАНАЎЛЕНЬНЯ ПРАЦСТАЖУ.

ЦП саюзу працасьветы на дагаворапасьці з Наркампрацы ўнараджаваў пытаньне аб устанаўленьні прапоўнага стажу асьветнікаў, якія згубілі свае дакумэнты ў часе эвакуацыі, імкрызялістычнай і грамадзянскай вайны.

Каб сарасьціць разгляд спраў па ўстанаўленьню прапоўнага стажу асьветніка, акруговым страхкассам дадзена права, замест выкліканьня сьведак на пасяджэньне камісіі, даручаць сваім упаўнаважным апытваць сьведак на месцах, а пратаколы апытаньня будуць зацьверджацца камісіямі акрстрахкас.

ДАПАМОГА АСЬВЕТНІКАЎ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

Культадзел ЦП саюзу працасьветы прымацаваў да кожнай найскорай часьці Менскага гарнізону групком ці мясцком саюзу, якія праводзяць ліквідацыю вянісьменнасьці, кіруюць розным гурткамі. Апрача таго, асьветнікі чытаюць на клюбах лекцыі, робяць даклады і г. д.

Пры Доме Чырвонай арміі сіламі асьветнікаў Менску арганізаваны курсы для камандзіраў і палітычнага складу. Курсы працуюць па праграме сямёхгодкі і дзевяцёхгодкі і рыхтуюць чырвоных байцоў для паступленьня ў вайсковую Акадэмію.

Дашкольніцы 7-га групкому працасьветы арганізавалі пры Доме Чырвонай арміі дзіячы пакой.

Усю працу асьветнікі праводзяць у нарадку грамадзкай працы.

Рыхтуемся да вясеньняй сяўбы.

Больш увагі ачыстцы насеньня.

Сёлета пастаўлена заданьне ачысьціць у БССР на меш 50 проц. усяго яравога насеньня. Наркамзем з самай восені даў месцам дырэктывы своечасова распачаць зерноачышчэньне, каб на прышлося, як летась, усю работу праводзіць у апошнія 1-2 месяцы.

Трэба адзначыць, што і сёлета кампанія зерноачышчэньня не належна яшчэ разгарнулася. Па тых вестках, якія атрымаў Менскі акруговы земельны аддзел, можна зрабіць вывад, што РВК ня досыць сур'ёзна адносяцца да гэтай задачы. Напрыклад, Чэрвенскі райён ачысьціў да 1-га сьнежня каля 11 тон насеньня. У Плешчаніцкім райёне толькі 2-га сьнежня пусьцілі ў ход машыны.

Да гэтага часу зерноачыстныя пункты працуюць без належнай нагрузкі, а пад вясну пачнецца гарачка, пачнуцца вялікія чаргі. Вось чаму ўсе РВК павінны цьвёрда і няўхільна праводзіць дырэктывы партыйных і савецкіх органаў аб своечасовым і плянавым выкананьні кампаніі зерноачышчэньня.

Кожны пуд ачышчанага насеньня, кожнае каліва зьнішчанага сьмецьця—зьяўляецца вялікай дапамогай на фронце павялічэньня ўраджайнасьці. Ад самага сялянства залежыць павялічэньне ўраджайнасьці сваіх палеткаў, ад іх самых залежыць, каб замест сьвірэпкі, дурнап'яна ды інш. сьмяцьцёвых расьлін, якія нішчаць і глушаць нашы палі, расло-б чыстае збожжа. Ад нас саміх залежыць падвышэньне ўраджаю.

Вось чаму ўсе сьвядомыя савецкія грамадзяне, селькоры, земельныя працаўнікі павінны адразу-ж распачаць сігналізацыю, як праводзіцца на мясцох зерноачышчэньне. Усялякая нядбайства ў гэтай справе трэба карань самым жорсткім спосабам. Машыны ў нас ёсьць, і, неадкладаючы, трэба адразу пусьціць у ход абозы і машыны на пракатных пунктах.

Адначасна з гэтым усе РВК павінны паклапаціцца, каб выкарыстаць тыя 60-70 тысяч руб. з мясцовага бюджэту, якія асыгнаваны на набыцьцё зерноачысных машын. Прычым гэтыя сродкі трэба адпусьціць у першым квартале, каб можна было заранжа набыць поўнасьцю патрэбныя машыны, а не чакаць водпуску сродкаў да чэрвеня ці да ліпеня, калі прыходзіцца ўжо ня сеяць, а выпімаць ураджай.

Поўнае ажыцьцяўленьне кампаніі зерноачышчэньня будзе дасягнута толькі ў тым выпадку, калі гэтай справе будзе нададзены шырокі грамадзкі характар. Не павінна быць ніводнай вёскі, ніводнага сельсавету, з-ту ўзаемнае дапамогі, у якіх-бы не абмяркоўвалася гэта пытаньне.

Загатоўка насеньня ўжо пачалася.

Гэтымі днямі пры Наркамгандлі адбылася нарада загатавіцеляў, якая абмяркоўвала плян загатовак да надходзячай вясеньняй сяўбы. Пастаноўлена забраніраваць усё палепшанае насеньне ў савгасах. Усе загатавіцелі павінны тэрмінова здаць Белсельсаюзу загатоўленае збожжа. Кандыцыя насеньня будзе адразу вызначацца, каб добраякаснае насеньне захаваць.

Перспэктывы на фронце загатовак насеньня.

Цэнтральны склад закупіў ужо 128 тон насеньня пермскай канюшыны. Таксама закуплена патрэбнае насеньне лугавых траў, карняплодаў і гародніны.

Што-ж датычыцца лубіну і вікі, дык справа пакуль што ня вызначылася: з загатоўкамі вікі пакуль што прыходзіцца ўстрымацца, бо яна сёлета вельмі вільготная, а хаваць ле няма дзе, з лубінам таксама невядома, бо ён яшчэ не малаціўся. Як Цэнтрасмэскад, так і Белсельсаюз робяць захады да загатоўкі вікі ў больш сухіх райёнах.

На лініі Белсельсаюзу заключаны дагавор з насеньнясаюзам на завоз 164 тон пермскай канюшыны, рэшта 293 тоны прыдзецца загатовіць на мясцовым рынку, часткова завезьці.

З насеньнем аўсу і ячменю справа абстаіць вядрэвна, часткова гэта насеньне будзе загатоўлена на мясцовым рынку, часткова завезена з іншых райёнаў Савецкага Саюзу, галоўным чынам, палепшанага аўсу.

Дзеля забесьпячэньня броварных райёнаў бульбай гатунку «вольтман», у савгасах Белсельтрэсту забраніравана 1953 тоны бульбы гэтага гатунку. Таксама закуплена ўжо 117,5 тон насеньня карняплодаў, 25 тон насеньня гародніны, у тым ліку і саджанцаў цыбулі.

Зьвернута ўвага на палепшаньне якасьці плугоў. Нашы заводы распачалі з 1-га кастрычніка выпуск плугоў па поўнаму стандарту. Вясной ужо будуць на рынку плугі новага выпуску.

ДА НАС У ЭКСКУРСІІ!

(Случчына---здраўніца).

Случчына—вельмі ўдзячнае месца ўля экскурсій. Там ёсьць надзвычайна шмат прыгожага.

У цэнтры райёну маляўнічым відам вызначаюцца паўдзёва-ўсходнія ваколіцы г. Слуцку—прадмесьце Востраў і бераг рэкі Случы каля в. Агародзікаў. Сам на сабе Востраў прадстаўляе ў летнюю пару частку гораду, залітую морам садовай зелені, сярод якой, як гнёзды ластавак пад страхой, пахаваліся вабныя домікі астравян. З другога боку Востраў прымыкае к самай рацэ, якая тут мае сухі бераг з пясчаным дном, удобным для купаньня.

Тут-жа недалёка (2-2 в пал. клм.) знаходзіцца і вёска Агародзікі на левым беразе Случы, на высокім сухім месцы. Ад вёскі на працягу больш кілёмэтра бераг рэкі надзвычайна цікавы. Высокі абрывісты, у большасьці парослы дробнымі дубовымі і арэхавымі кустамі, ён зьяўляецца месцам масавых прагулак, спатканьняў, маёвак. У многіх месцах бераг так крута падымаецца над вадой, што спусьціцца ўніз вяма мажлівасьці. Тут-жа, як лісты ў кнізе, відны чыстыя напластаваньні геолёгічных пародаў глебы. А калі прыняць пад увагу, што на ўсход за вёскаю Случ прымае свой прыток Вясейку, то зразумела, само сабой напрашваецца сюды масавая экскурсія са школьнікамі. Тут на месцы шмат чаго можна практычна дасьледаць, абгаварыць з імі.

У паўднёвай частцы райёну знаходзіцца другое прыгожае месца. Я маю на ўвазе савгас Бранчыцы і невялікі (каля 5 дзесяцін) лес у савгасе пад назваю «Казак». Лес гэты праўдзівей назваць батанічным садам, высаджаным сярод палёў і бяльлесных прасторaў Случчыны.

Пасярод яго праходзіць шырокая дарога, якая падобна да алеі, высаджанай з абодвых бакоў вялікім лікам лісьцьвеніц, каштанаў, белых акацый, хвой розных пародаў, дубоў і грабаў. У папаўшага сюды чалавека з нярпрывычкі вочы разьбягаюцца, ён ня ведае, чаму тут аддаць перавагу, на чым застанавіцца? Усё просіць маляўнічага пэндзеля мастака, або пластынкі фатографа...Мясцовасьць узвышаная, здаровая, з лагодным ап'яняючым пахам квітнеючых дрэў, агляне далёкія віды на ваколіцы. Гэта так званае ў Случчыне «Бранчыцкае» ўзгор'е.

У самым савгасе зьвартае на сябе увагу парк, дзе, акрамя мясцовых пародаў (цікава цёмная грабавая алея), сустракаюцца наступныя пароды дрэў: чорная бярэза, лісьцьвеніцы, вайматава і аўстрыйскія сосны, туі, плакучыя івы (апусьціўшыя да зямлі свае галіны), сібірская піхта, італьянскія арэхі, канадзкая ель, жоўты вяз, плакучы ясень, ясенявідны клён, югаслаўскія елі, кратэгус, пірамідальны дуб, бальзамічная ель і інш. Сюды не памяшала-б заглянуць калі-небудзь прадстаўнікам ІБК, у прыватнасьці яго камісіі па ахове прыродных помнікаў, каб узяць на вучот гэты запраўды цікавы куток нашага райёну.

У паўднёва-ўсходнім кірунку маем Уручча, вядомае, як дачнае месца не адным толькі жыхаром г. Слуцку. Яго ведаюць значна далей: Менск, Бабруйск, а часам Масква і Ленінград. Узвышанае месца, блізасьць чыгункі, наліччa вялікіх сасновых лясоў, здаровае, сьвежае паветра,—усё гэта спрыяе таму, што на лета сюды зьязджаецца шмат публікі, якая прыносіць ажыўленьне ў цішыню адвечнага бору.

Дачны пасёлак мае перспэктывы на рост і пашырэньне. У ім выдзяляецца дом лясьніцтва з высокаю каланчою для нагляду за лясными пажарамі. Каланча ў 2 разы вышэй слуцкай. З яе вышкі адчыняюцца вельмі прыгожыя малюнкі на далёкія прасторы, а ўніз хвалюецца лес, які цягнецца далёка-далёка кругом, пакрыты сіневатай дымкай туману. Вёскі, хутары і пасёлкі на гарызонце, здаецца, прытуліліся да грудзей зямлі, як-бы шукаючы там укрыцьця ад вачей сьмелага гледача... Уручча са сваімі лясамі зьяўляецца *здраўніцай* нашага раёну, і ня ведаць такога куткa нельга.

Ня меней прыгожы і ўсходні куток раёну. Тут кідаецца ў вочы пабудова самай паверхні. Калі ў цэнтры маем раўніну, то тут мясцовасьць прымае характар узвышша, якія чарадуюцца з далінамі і нізінамі. Гэта свайго роду „Швэйцарыя" Случчыны. Найбольш высокім пунктам зьяўляецца тут Мір-Гара пры вёсцы Сарагаю—97 саж. над роўнем мора. Гэта самае высокае месца ў раёне. Парослая лесам, які цяпер часткаю вынішчан, яна дае магчымасьць з верхавіны сваёй бачыць чуць ня ўвесь раён. Адсюль добра відаць Уручча, Ст.-Дарогі, а ў ясную пагоду—трубы і дым слуцкіх паравікоў, не гаворачы ўжо аб буйным ліку вёсак, засьценкаў і хутароў. Усё гэта разам узятае надае ёй асаблівае значэньне, якое, зьмешаўшыся з народнымі лягендамі, перадаецца і падтрымліваецца на працягу вякоў. Не здарма-ж яшчэ ў даўныя часы паны пастараліся скарыстаць гэты куточак, аб'явіўшы тут «прошчу». Ад тэй сасны, на якой «зьявілася» ікона, застаўся цяпер толькі вялікі дуплісты пень, які і дагэтуль раз у год напаўняецца яшчэ маслам, сырамі, мёдам, палатном і інш. сялянскімі прадуктамі на напоўскую карысьць.

Нарэшце, у заходняй частцы райёну адчыняецца чыста беларускі краявід з развалінаю Замчышча ў м. Леніна. Нейкім спакоем і цішынёю вее адсюль. З аднаго боку тут цягнуцца ўраджайныя слуцкія палі з квітнеючым жытам і пшаніцаю, якія пастанова пераходзяць у нізіну рэкі Удувы. Далей віднеецца само мястечка, схованае пад купай зялёных дрэў, а і другога боку пацягнуўся беларуска гасьцінец абсаджаны абапал сталетнімі бярозамі. Гасьцінец выгібаецца ў розныя бакі і, здаецца, гэта пацягнулася зялёная істужка, якая застаўляе часам пасьля сябе пыл ад праежджых падвод.

Летась у нас перабывалі тысячы экскурсантаў і дачнікаў. Рыхтуйцеся і сёлета да нас папраўляцца!

П. Ажэўскі.

Значэньне вапнавых адкідаў Дабруской папяровай фабрыкі.

Вапнаваньню глебы, як аднаму з спосабаў падняцьця ўраджайнасьці палёў, да гэтага часу ў нас надавалі мала значэньня і толькі ў апошні час, калі ва ўвесь рост паўстала пытаньне аб вынаўленьні ўсіх мер і спосабаў, якія спрыялі-б павялічэньню агульнай сельска-гаспадарчай прадукцыі, успомнілі і аб такой важнай агранамічнай рулзе, якой зьяўляецца вапна ў сельскай гаспадарцы.

Упершыню аб вапне, як угнаеньні, успамінаецца ў літаратуры ў 1771 г., далей у 1780 г. гаворыцца, што вапне, мергеляваньню, трэба надаць асаблівае значэньне ў сельскай гаспадарцы, як фактару павышаючаму ўраджаі хлебных расьлін. Пасьля надыходзіць стогадовы перарыў, у працягу якога аб вапне, як угнаеньні, не гавораць.

У 1865 годзе вядомы расейскі агранам І. Стэбут разіць ужываць вапну ў кампостах. Далей агранам Костычаў у 1884 г. ужо зусім выразна зазначае на вапну, як на часткова дзейнічаючае ўгнаеньне, якое спрыяе павышэньню ўраджайнасьці палёў.

Шэрагам вопытаў прызнана, што вапна зьяўляецца неабходнай спажыўнай матэрыяй для расьлін. Наша падзолістая глеба, бедная спажыўнымі матэрыямі, адзначаецца сваёй вышчалачнасьцю і кісласьцю, што асабліва шкодна адбіваецца на рэжыме спажыўных матэрый, таму ўнясеньне вапны ў падзолістую глебу зусім зьменіць яго ў сэнсе ўплыву на фізыка-хімічную прыроду глебы.

Вопытамі высьветлена, што вапна ў глебе стварае вельмі спрыяючыя ўмовы для атрыманьня найбольшай эфэктыўнасьці.

Узьнікае пытаньне: ці ёсьць у межах БССР вапна, каб можна было задзейсьніць карысную і вельмі патрэбную меру вапнаваньня падзолістай глебы БССР.

Водлуг даных, залежы вапняка і вуглякіслай вапны, крэйды і мергелю ў БССР значныя ў Клімавіцкім райёне, у Гомельскай, Менскай і Магілёўскай акругах і ў некаторых іншых месцох і прытым залежы гэтыя настолькі вялікія, што распрацоўка іх для сельскай гаспадаркі неабходна, і гэтай справай трэба заняцца своечасова. Апроч гэтага багацьця, якое ляжыць у нетрах зямлі і прыкрыта часамі больш-менш магутнымі наносамі, мы ў сучасны момант маем зусім нескарыстанае народнае багацьце, якое можа даць амаль без затрат сродкаў вялікую карысьць нашай сельскай гаспадарцы.

Гэта наша багацьце замнажалася дзесяткамі гадоў і замнажаецца ў сучасны момант пры Дабруской папяровай фабрыцы ў выглядзе вапнавых адкідаў, якіх, на нашаму падліку, будзе ў сярэднім каля 6.000.000 пудоў (крэйды), што дасьць угнаеньня, лічачы ў сярэднім па 200 пудоў на дзесяціну, на плошчу каля 30.000 дзесяцін.

Дзейнічаньне гэтых адкідаў вывучаецца ўжо чацьверты год на палёх Энгельгардаўскай Вопытнай Станцыі і ў шэрагу іншых месц.

Даныя Энгельгардаўскай Вопытнай Станцыі па ўжываньню вапнавых адкідаў наступныя: (тэкст падаем поўнасьцю).

«Вынікі палявога вопыту з жытам па параўнаўчаму вывучэньню вапны з папяровымі адкідамі Дабруской папяровай фабрыкі, пастаўленага ў 1927 годзе.

Вопыт пастаўлен у шматпольным севазвароце (дзесяціпольле) з вывучэньнем яе дзейнічаньня ўгнаеньня на жыта, так і дзейнічаньня яго на наступныя за жытам культуры—канюшыну і інш. У схему вопыту ўведзены нормы ўгнаеньня—120 пуд. і 300 пуд. на дзес. Папяровыя адкіды раўналіся з мясцовай вапнай. Глеба вучастку—ападзолены суглінак.

Ураджай зярна жыта ў цэнтн. на гектар:

	Зярна.	Прыбаўка ў параўн. з науг.	Прыбаўка зярна ў проц.
Вапна 120 пуд .	13,81	+0,67	5
Без угнаеньня .	13,14		
Папяр. адк. 120 п. .	12,57	+1,13	9
Без угнаеньня .	11,44		
Вапна 300 пуд. .	12,90	+3,15	32
Без угнаеньня .	9,75		
Папяров. адкіды .	9,85	+2,05	26
Без угнаеньня .	7,80		

На падставе вынікаў палявога вопыту з жытам у 1927 г. можна прыйсьці да наступнага выводу: на эфэкту дзейнічаньня папяровых адкідаў ні ў якой меры ня горш вапны, і таму адкіды, як угнаеньне, могуць замяніць вапну».

Далей падаем даныя па скарыстаньні адкідаў Дабруской фабрыкі ў вопыце вэгетацыйным (тэкст Вопытнай станцыі падаем дасло ўна):

«Вынікі вопыту на вывучэньню вапнавых рэшткаў Дабруской папяровай фабрыкі ў 1927 годзе.

Вопыт вэгетацыйны. Раўнаўся ўплыў вапнавых рэшткаў з уплывам чыстай едкай (гашанай) вапны і вуглякіслай (крэйды), а таксама з уплывам малога сырога вапняка мясцовага паходжэньня (іздзешкаўскага) на авёс, лён і лубін.

Нормы ўнясеньня ў глебу ўзяты наступныя. Рэшткі папяровай вытворчасьці: 200, 300, 400 і 600 п. н/д. едкай і вуглякіслай вапны: 400, 800, 1200 і 1600; вапняка: 300, 600 і 900 п. н/д. Глеба ўзята спустошаная і нічым ня ўгноеная; ступень яе ненасычанасьці вызначана 0,27 проц.

У ніжэй зьмешчаных табліцах паказаны ўраджайныя даныя ў процантах ад няўгноеных судзінаў.

Авёс (агульная вага)

Рэшт. папяров. вытворчасьні.		Едкая		Вуглякіслая		Вапняк	
Пуд. н-д.	Ураджай.	Пуд. н-д.	Ураджай.	Пуд. н-д.	Ураджай.	Пуд. н-д.	Ураджай.
0	100	0	100	0	100	0	100
200	172	400	114	400	144	300	122
300	180	800	211	800	180	800	124
400	169	1200	105	1200	172	900	172
600	155	1600	80	1600	172		

Лён (агульная вага).

0	100	0	100	0	100	0	100
200	124	200	88	200	105	300	132
300	170	300	90	300	63	600	138
400	186	400	77	400	82	900	120

Лубін (вага зялёнай масы).

0	100	0	100	0	100	0	100
100	167	200	61	200	108	300	115
200	180	300	55	300	93	600	123
300	189	400	37	400	92	900	107
400	144	600	11	500	92		
		800	10				

З табліцы відаць, што ва ўсіх выпадках на першым месцы па свайму ўплыву на ўраджай стаяць вапнавыя рэшткі папяровай вытворчасьці, пры чым аптымальнымі (а для аўса і лёну магчыма і недастатковымі) нормамі ў умовах вэгетацыйнага вопыту аказаліся для аўса 600 п. (9016 кгр.), для лёну 400 п. (6011 кгр.) і для лубіну 300 п. (4508 кгр.) на дзесяціну. Прычына такога добрага ўплыву рэшткаў лябараторный будуць вынятыя на скончэньні далейшых аналізаў і паведамлены своечасова. У будучым сезоне вопыт будзе перанесен у палявыя ўмовы на лябараторны вучастак для праверкі і ўяўленьня вынікаў працы 1927 г.

Адкіды крэйды, сабраныя ў вялікую гару ў Дабрушы пры папяровай фабрыцы, у выглядзе самасадачнай крэйды выявіліся ў выніку загатаўленьня едкага варачнага шчолаку для варкі саломы. Шчолак гэты робіцца з раствору кальцыявай соды і едкай вапны; у растворы зьмяшчаецца раствор каустычнай соды, а ў асадку амаль выключна крэйда. Працэс мае назву каўстызацыі соды.

Па свайму хімічнаму складу крэйда гэта зьяўляецца вельмі чыстым прадуктам, у якім каля 95 проц. крэйды, каля 0,15 проц. жалеза, 3-4 проц. крэмнязёму і да 1 проц. іншых мінеральных і арганічных матэрый

Кожнаму па заслугах.

(На пасяджэньні бюро скаргаў РСІ 14-XII).

БУДУ ЛЕПШ ФАРМАЦЭЎТАМ У МЕНСКУ, ЧЫМ УРАЧОМ НА ВЁСЦЫ.

Гр-н Лявініч працуе фармацэўтам ужо даўно. Адначасова з гэтай працай ён тры гады таму назад скончыў мэдфак БДУ і застаецца працаваць фармацэўтам у аптэцы далей. Апроч аптэкі ён стажыруе у клініцы і, калі патрабуе (у час эпідэміі грыпа, шкарлятыны і інш. пошасных хваробаў) ён яшчэ прырабляе рублёвы паўсотні у месяц у амбуляторыі.

Ня гледячы на тое, што ён скончыў мэдфак і дзяржава затраціла вялікія грошы на яго адукацыю, на райён ён ехаць «ня можа».

Для гэтага, бачыце, вельмі шмат прычын – першая з іх, гэта ў гр-на Лявініча правая рука каранёй, чым левая (сам гэта ён на бюро скаргаў казаў), па-другое, ён вельмі нервовы, па-трэцяе—яго жонка працуе ў Менску і інш. прычыны.

Адным словам лепш фармацэўтам...

Прадстаўнік ЦП саюзу мэдсанпрацы заявіў, што ў Менску такі аматар не адзін, ёсьць і яшчэ ўрачы-фармацэўты і акруг ўрачы, якія займаюць на 2-3 пасады.

Тут-жа прадстаўнік біржы працы заявіў, што на біржы ёсьць беспрацоўныя фармацэўты.

Пагатаму пытаньню бюро скаргаў, пад старшынствам тав. Сьвірыдава, пастанавіла:

Лічыць ненармальным становішча, калі ўрач выконвае працу фармацэўта і ў той жа час на біржы ёсьць беспрацоўныя фармацэўты, а на райёнах не хапае дактароў.

Прапанаваць Камісіі Аховы здароўя ў двухтыдневы тэрмін вывучыць гэтае пытаньне і зьвінчыць ненармальныя зьявішчы.

ЗА НЯПРАВІЛЬНЫ ПРЫЁМ НА ПРАЦУ.

Патрэбна была ў БДТІ прыбіральніца.

Згодна кадэкт. умовы дырэкцыя павінна была браць на працу новых працаўнікоў з ліку беспрацоўных членаў саюзу рабіс, а дырэкцыя прыняла ня члена саюзу—жонку свайго вартаўніка, нібы таму, што новы чалавек будзе «не чист на руку».

Бюро скаргаў пастанавіла: вынесьці суровую вымову дырэкцыі тэатру, а прынятую ня працу асобу бэз згоды саюзу і ведама біржы, з працы зьняць.

МАХІНАЦЫІ ЗУБМАЙСТРОЎ-ПРЫВАТНІКАЎ.

Зьмяншаюцца з кожным годам прыбыткі майстроў зубных спраў.

Хворыя лічаць цяпер больш мотазгодным лячыць зубы ў амбуляторыях, там хоць у чарзе пастаіш, але зуб выдзяруць даромна, а ў прыватніка часамі і ў чарзе пастаіш, і зуб выдзяруць, і ў дадатак сауру зьдзяруць.

Аднак зубмайстра Рудзіцкі ня сумуе.—Ён адчыніў нелегальную школу зубных тэхнікаў і зьдзірае скуру з іх за навучаньне.

Аб яго фокусах было паведамлена 3 краснавіка г. г. інспэктару працы т. Таўкачову. Але справа чамусьці засталася бэз руху. Пакуль нідзе другая заява не пашлася ў бюро скаргаў РСІ.

Бюро пастанавіла—прымаючы пад увагу цяперашні з боку інспэктара працы вынесьці яму вымову: даручыць інспэкцыі працы ў двухтыднёвы тэрмін вырашыць гэту справу згодна існуючых законаў.

ХВАРОБА Ў ЖАНЦЕ № 1.

Цяжка сказаць, хто каму не спадабаўся—праўленьне Жанта кіраўніцы жактаўскага дзіц. саду, ці наадварот.

Скарэй усяго не падабаліся адзін другому.

Склалася такое становішча, што праўленьне паставіла пытаньне аб пераводзе кіраўніцы саду ў іншую ўстанову.

Справа таксама пайшла ў рэспубліканскую універсальную бальніцу—РСІ, дзе хочаць ад усякай хваробы, у тым ліку і ад склочніцтва.

Бюро скаргаў вывучыла гэту хваробу і паставіла дыягназ—«Склока» (па латыні ня ведаю як сказаць). А лякарства прыпісана наступнае:

Прызнаць, што з боку праўленьня жанту было ня ўмелае кіраўніцтва садам, з другога боку кіраўніцтва садам не заўсёды разумела рэспараджэньні праўленьня, на глебе чаго пачалося склочніцтва.

Папярэдзіць праўленьне жанта і папярэдзіць саду, што калі непаразуменьні ня будуць зьнішчаны, то будуць ужыты больш рашучыя меры.

Кіраўніцы саду Залікман вынесена суровая вымова.

К—Я.

На барацьбу з бездарожжам

(Праэкт дарожнага будаўніцтва па Менскай акрузе на бліжэйшыя 5 год).

Па Менскай акрузе налічваецца 15527 кілёмэтраў шляхоў. З іх—II разраду (акруговага значэньня) 1082 клм.; (дарогі I разраду, дзяржаўнага значэньня) у гэту лічбу ня ўключаны; III разраду (райённага значэньня) 1082 клм.; і IV разраду (дарогі сельскія) 11900 кілёмэтраў.

На працягу бліжэйшых пяці гадоў на рэмонт, аднаўленьне і пабудову новых дарогі на акрузе маркуецца на аднаму варыянту расходаваць 5623911 руб., а па другому варыянту, пры ўтаненьні матар'ялаў і павышэньні кваліфікацыі рабочых, 5429981 р..

Гэта сума (па першаму варыянту) будзе разьмеркавана такім парадкам:

На будаўніцтва акруговых дарог 2267060 руб., райённых 680624 р. і сельскіх дарог 2676227 руб.

Сродкі на дарожнае будаўніцтва будуць паступаць з наступных крыніц: асигнаваньні на акруговаму і райённых бюджэтах, паступленьні ад натовнага збору, выдачы з дубэзпечнага фонду, самаабкладаньне і безграшовыя прыбытки—льготны водпуск лесу і дарожная трудавая павінасьць.

ЭФЭКТЫЎНАСЬЦЬ ГРАШОВЫХ УКЛАДАНЬНЯЎ У ДАРОЖНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Магчыма, што знойдуцца скептыкі і скажуць—ці варта траціць такія сродкі на дарожнае будаўніцтва, калі і зьдзілі тысячы гадоў, будзем жыць і далей.

Такая думка, бязмоўна, была-б няправільнай. Каб давесьці няправільнасьць гэтай думкі прывядзем для ілюстрацыі эканомію насельніцтва ад прывядзеньня нашых шляхоў у належны парадак.

Бяром шляхі II разраду (акруговы). Пры сучасным становішчы шляхоў правоз адной тоны грузу гаштуе ў сярэднім 40,3 кап. на кілёмэтр. Што пры колькасьці перавозак у 10977000 тонн-кілёмэтраў складае агулам 3067766 руб.

Для прывядзеньня ў поўны парадак акруговых шляхоў вэльходна выдаць 7272564 руб., і тады-б кошт перавозкі зьнізіўся-б да 23,6 кап. за тонну-кілёмэтр, ці на 41,5 проц., а агульны выдатак на перавозкі зьнізіўся-б да 1798801 руб., ці на 1268965 руб. Такім чынам, выдаткі на прывядзеньне ў поўны парадак дарог акрыліся-б у працягу 5,74 гадоў.

Але такіх выдаткаў (7272564 руб.) зрабіць цяпер немагчыма, прыходзіцца задаволіцца толькі 2267060 р., ці 36,7 проц. патрэбнай сумы. І ўсё-ж калі выкарыстаць на дарожнае будаўніцтва акругі гэтыя 2267060 р., то правоз грузаў зьменшыцца да 29,8 кап. за тону-кілёмэтр, а ўсяго зьменшыцца выдаткі насельніцтва за перавозку грузаў да 22226691 р., ці на 841075 руб. у год.

Значыць, выдаткі на будаўніцтва акруговых шляхоў у суме 226691 р. акупяцца праз 2,7 гады.

Такім чынам, укладаньні ў дарожнае будаўніцтва зьяўляюцца вельмі выгаднымі зьвяшчэньнем капіталаў.

ШТО МЯРКУЕЦЦА ЗРАБІЦЬ.

Пры поўным ажыцьцяўленьні вызначанай праграмы дарожных работ, дарожная гаспадарка на Менскай акрузе палепшыцца наступным чынам.

АКРУГОВЫЯ І ПАД'ЯЗДНЫЯ ШЛЯХІ.

З агульнай сеткі мастоў даўжынёю 4217 пагонных матраў будзе: а) капіт. адрамант. 1161,85 пог. мт. ці 27,7 проц., б) адноўлена 2399,05 п. м. ці 58,8 проц., в) новых работ 160 п. м., ці 3,8 проц., г) новых пабудоў 150 п. м. ці 3,6 проц. Усяго 3870,91 п. м. ці 91,9 проц.

З агульнай сеткі дарожнага палатна без каменнай адсыпкі даўжынёю 970 кілёмэтраў будзе: а) капіт. адрамант. 48,79 кл. ці 5,03 проц., б) адноўлена 80,03 кл. ці 8,25 проц, в) новых работ 38,44 кл. ці 3,96 проц., г) новага будаўн. 86,43 кл. ці 8,90 проц. Усяго 253,69, ці 26,14 проц.

З агульнай сеткі дарожнага палатна з з каменнай адсыпкай даўжынёю 94,25 кілём. будзе:

а) капіт. адрам. 3,90 кл. ці 4,09 проц.
б) новага будаўн. 52,34 кл. ці 54 проц.
в) новых работ 35,19 кл. ці 35,7 проц.

Усяго 91,43 кл. ці 94,06 проц.

РАЙЁННЫЯ ДАРОГІ.

З агульнай сеткі ўсіх мастоў даўжынёю 9817 пог. мэтраў будзе:

а) капіт. адрам. 1450,13 п. м. ці 14,4 проц., б) адноўлена 2989,5 п. м. ці 25,8 проц. Усяго 3939,64 п. м. ці 40,2 проц.

З агульнай сеткі палатно даўжынёю 2545 кіл. будзе: а) капіт. адрам. 113,02 кл. ці 4,45 проц., б) адноўлена 15,82 кл. ці 6,10 проц. Усяго 168,84 кл. ці 10,55 проц.

СЕЛЬСКІЯ ДАРОГІ.

З агульнай сеткі з усіх мастоў даўжынёю 5950 пог. мэтраў будзе: нанова пабудавана 3159,27 пог. мэтраў, ці 52,99 проц.

З агульнай сеткі грунтавых сельскіх дарог даўжынёю 11900 кілём. будзе: а) капіт. адрам. 1721,79 кл., ці 14,59 проц., б) нанов. пабудав. 7006,6 кл. ці 58,9 проц. Усяго 8727,99 кл., ці 73,4 проц.

Такі малюнак будзе мець дарожная гаспадарка Менскай акругі праз пяць гадоў.

Гэтую праграму необходна выканаць, бо аб карысьці добрых дарог гаварыць ня прыходзіцца.

Не справу дарожнага будаўніцтва павінны вызвяруць асаблівую увагу ячэйкі аўтадору на вёсцы, шляхам уцягненьня сялян у ячэйкі і растлумачэньня ім значэньня дарожнага будаўніцтва, якое дзяржава праводзіць.

Аўтадоравец.

ХРОНІКА.

Падрыхтоўка да 10-годзьдзя БССР.

У саюзе мэталістых.

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня 10-годзьдзя абгалошэньня БССР па саюзу мэталістых распачалася яшчэ ў нашы лістапада. 2 сьнежня адбылася нарада прадстаўнікоў аругоных арганізацый саюзу. На гэтай нарадзе ўсебакова было абгаворана пытаньне аб падрыхтоўцы да сьвяткаваньня і правядзеньня самага сьвята 10-годзьдзя БССР. Зараз па ўсіх фабзавкомах ідзе падрыхтоўка да сьвяточных вечароў. Да дню сьвята будзе адчынена 2 чырвоныя кутні на заводзе «Энэргія» і пры аб'яднаным завоме г. Менску. Пры заводзе „Энэргія" будзе адчынена „сталоўка для рабочых.

У саюзе сельска-гасп. рабочых.

Да дню сьвяткаваньня 10-годзьдзя БССР па лініі саюзу сельска-гаспадарчых прыўрочваецца адчыненьне чырвоных кутко́ў, хат-батрана і лікпунктаў. Зараз на месцах праводзіцца праверка працы саюзу ў галіне ліквідацыі неграмотнасьці. На сходах членаў саюзу паводзіцца ітогі нашага культурна-гаспадарчага будаўніцтва за 10 год. Дзень сьвята будзе адзначаны наладжаньнем урачыстых вечароў з пастаноўкамі.

Мерапрыёмствы да ўзмацненьня працкалектываў.

У сувязі з недастатковым забесьпячэньнем сыравінай працкалектываў, прэзыдыум ЦСПСБ даручыў Наркампрацы катэгарычна адстайваць перад адпаведнымі цэнтральнымі органамі павялічэньне водпуску сыравіны працкалектывам.

Побач з гэтым пастаноўлена зьвярнуць увагу Наркамгандлю БССР на необходнасьць прыняцьця мер у адносінах Белсельсаюзу, Белкаапсаюзу, Белпачтаму і Дзяржгандлю, якія ня выконваюць задання па забесьпячэньню працкалектываў розвай сыравінай. Пастаноўлена таксама прасіць ВСНГБел. пры разьмеркаваньні кантынгенту імпарту забясьпечыць працкалектывы як сыравінай, так і машынамі і выдзеліць ім необходную колькасьць валюты.

У сувязі з тым, што частка гандлёвых працкалектываў яшчэ не перададзена цэрабкомам, пастаноўлена зьвярнуць увагу НКГандлю на забясьпечаньне працкалектываў таварамі. Наркампрацы даручана прыняць больш рашучыя меры да перадачы акрэсных працкалектываў адпаведным гаспадарчым арганізацыям.

Нядзельны ўнівэрсытэт для чырвоных байцоў.

Сіламі саюзу працаўнікоў асьветы пры Доме Чырвонай арміі арганізуецца нядзельны унівэрсытэт для камандныга і палітычнага складу Чырвонай арміі. Унівэрсытэт арганізуецца па ўзору рабочага нядзельнага унівэрсытэту і будзе абслугоўвацца асьветнікамі мясцкому БДУ ў парадку грамадзкай працы.

На самалёт „Беларускі Школьнік".

Вучні менскай 29 сямігодкі сабралі на самалёт «Беларускі Школьнік» 9 р. 26 кап. і заклікаюць вучняў іншых школ зрабіць тое самае.

Курсы па падвышэньню асьветы і кваліфікацыі.

ЦП саюзу савгандлясслужачых адчыніла вечарнія агульна-адукацыйныя курсы на 65 чал. членаў саюзу. Заняткі на курсах праходзяць тры разы ў тыдзень.

З 1 студзеня куп таддзел саюзу савгандлясслужачых адчыніе курсы стэнаграфіі. Праграма курсаў стэнаграфіі разьлічана на 9 месяцаў, на курсы будзе прынята 40 чалавек.

Замежныя машыны для панчошна-трыкатажнай фабрыкі.

Беларуская Ўправа Дзяржгандлю БССР атрымала за апошні месяц в Нямеччыны для віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі 45 машын.

Апрача гэтага ў бліжэйшы час паступіць з Нямеччыны для гэтай-жа фабрыкі яшчэ партыя машын, у ліку 30 шчук.

Устаноўка гэтых машын дасьць магчымасьць палепшыць і павялічыць якасьць выпускаемай прадукцыі.

10-годзьдзе саюзу с.-гасп. рабочых БССР.

У пачатку лютага 1929 году саюз сельска-гаспідарчых рабочых будзе сьвяткаваць 10-годзьдзе існаваньня саюзу. На месцах ужо распачалася падрыхтоўчая праца да правядзеньня сьвяткаваньня 10-гадовага юбілею саюзу.

Радыёфікацыя вёскі.

Белкаапсаюз гэтымі днямі атрымоўвае з Масквы вялікую партыю радыёпрасовак, якія будуць працаваць пры кінопрасоўных спажывецкай кааперацыі.

Сёлета на лініі спажывецкай кааперацыі ў вёскі будзе працаваць 70 радыёпрасовак.

Электрыфікацыя савгасаў.

Белсельтрэст намеціў электрыфікаваць у 1929 годзе шэраг савгасаў. Будуць устаноўлены новыя электр станцыі ў савецкіх гаспадарках «Старыца—Лопухі» (Менская акруга), «Балавічы» і «Завалочыцы» (Бабр. акруга) і інш.

Электрыфікацыя гэтых савгасаў абыйдзецца ў 250000 р. б.

Масавая праверка зьнікненьня адм.-кіраўнічых выдаткаў

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў пачаць з 10 студзеня масавую праверку 20 проц. зьнікненьня адміністрацыйна-кіраўнічых і агульна-гаспадзкіх выдаткаў за 1927-28 год. Праверка павінна быць скончана да 1-га лютага 1929 г.

Закончан адбор курсантаў у Гавальскі цэх «Ціп».

Менская Біржа Працы закончыла сваю працу па адбору кандыдатаў у гавальскі цэх курсаў Цэнтральнага Інстытуту Працы. Усяго адазвана 60 членаў і 7 кандыдатаў.

Курсы ўкамплектаваны з беспрацоўных. Заняткі ў гавальскім цэху пачнуцца з 20-га сьнежня.

Забясьпечаньне фруктамі цэрабкомаў БССР.

Белрабсакцыя разгарнула працу па загатоўцы фруктаў для цэрабкомаў БССР.

З гэтай мэтай заключана тэраг дагавораў на закупку фруктаў з арганізацыямі Украіны, Туркестану, Крыму, Каўказу і інш.

СУД.

НЯДБАЙНАСЬЦІ МАШЫНІСТА І КАЧАГАРА

У Вузьдзенскім раёне, на заводзе-кабінаце «Уперад» адным з цэхаў абсталяваных адзяленьняў было мельнічнае адзяленьне.

Трэба адзначыць, што ва ўмовах Вузьдзенскага раёну мельнічнае адзяленьне на камбінаце зьяўлялася галоўным прамысловым прадпрыёмствам, абслугоўвала ня толькі Вузьдзенскі раён, але і шмат насельніцтва з іншых раёнаў.

Машыністам мельнічнага адзяленьня быў прызначан спец Сымон Янкаў Ничаеў, а качагарам Аляксей Язэпаў Колас. Ничаеў рэкамэндаваў сябе ня толькі машыністым, але і добрым механікам. Аднак рэкамэндацыя Ничаева не апраўдалася і спэцыяльнасьць яго хутка перанярвалася ў нядбайнасьць.

Пускаючы ў ход лёкамабіль мельнічнага адзяленьня, Ничаеў заўважыў, што трансмісійны вал хістаўся і каб падтрымаць яго падпіраў дрыўлянымі ўпорамі, і хоць і вельмі аб іх небясьпечнасьці, бо ад моцнага нагрэваньня, упоры, як дрыўляныя, вельмі часта гарэлі, але Ничаеў і Колас увагі на гэта не зварачвалі.

29 студзеня 1928 году лакамабіль быў пушчан поўным ходам, сам Ничаеў пашоў да хаты, а Колас вышаў пагуляць в заводскімі гарадзі, але Ничаеў і Колас увагі на гэта не зварачвалі.

29 студзеня 1928 году лакамабіль быў пушчан поўным ходам, сам Ничаеў пашоў да хаты, а Колас вышаў пагуляць в заводскімі гарадзі, але Ничаеў і Колас увагі на гэта не зварачвалі.

Дрыўляныя ўпоры і надкладкі трансмісійнага валу загараліся і пажар ахапіў усё мельнічнае адзяленьне, у выніку чаго адзяленьне пастаўшчыку каля 10000 руб. згарала ўшчэнт.

Менскі акруговы суд, разгледзеўшы гэту справу, пасаджаную 196 арт. КК, рэдакцыі 1928 году, прыгаварыў: Сымона Ничаева на адзін год пазбаўленьня волі, а Аляксея Коласа на пазбаўленьне волі на шэсьць месяцаў, а зьвяленьня з суровым адмежаваньнем.

ЗАБОЙСТВА НА ВЯСЕЛЬЛІ.

14-га лістапада ў грамадз. вёскі Закосьцы, Вузьдзенскага раёну, Паўла Коласа было вяселье.

Позна ноччу, калі ўсе госьці былі п'яныя, вядомы вяскоры хуліган Пётра Ліпай распачаў сварку, а потым і бойку з гасцямі вяселья Паўлам Коласам.

Калі Колас, выганяючы Пётру Ліпая з хаты, пачаў прасіць гасьцей дапамагчы яму суладзіць хулігана, на крык Пётры Ліпая прыбегі яго брат Янка Ліпай і сябра апошняга Сьцяпан Верабей і калі сталі біць на галасе Коласа, які і кончыўся, а Пётра Ліпай уцёк.

Пасьля забойства Коласа Янка Ліпай і Сьцяпан Верабей яшчэ доўга хадзілі па вёсцы з калам і наводзілі жах на ўсю вёску, пакуль іх не затрымала міліцыя.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Янку Мацеева Ліпая і Сьцяпана Лукашова Верабея на восем год зьвяволе на кожнага з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правах на два гады. Незалежна ад гэтага суд прысудзіў на карысьць жонкі забітага Натальлі Колас 38 руб. страт за пахаваньне забітага.

Я.

Менскі дзень.

— Сьвяткаваньне 5-цігодзьдзя Мопр'у БССР, згодна пастановы ЦК Мопр'у БССР, будзе праводзіцца 18-го сакавіка (дзень Парыскай Камуны).

Акруговам Мопр'у запрапачавана правесьці належную падрыхтоўку да часу сьвяткаваньня.

175 вагонаў вотрубей атрымае ў сьнежні месяцы БССР. Значная частка іх ужо завезена ў БССР.

Цэнтральны рабочы хор лічыць мэтагодным арганізаваць у Менску ЦП саюзу працаўнікоў мастацтва. Хор будзе складацца з рабочых ад варштату.

3000 руб. адпусьціў прэзыдыум «Дорпрофожу» МБС чыгуначнікам, на абсталяваньне аршанскага клюбу чыгуначнікаў.

Да судовай адказнасьці пастаўлены прыцягаць Нар. Ком. Гандаль БССР адміністрацыю Уаравійскага савгасу. Апошні прадаваў масла вытворчасьці савгасу не пэрабкому, а на прыватным рынку.

Рэарганізацыя факультэту права і гаспадаркі.

Пры Народным Камісарыяце Асьветы адбылася міжведамсьвенная нарада па пытаньню аб рэарганізацыі факультэту права і гаспадаркі БДУ. Нарада пастанавіла: прававое адзя. факультэту заставіць у такім выглядзе, у якім яно існуе ў сучасны момант. Эканамічнае адзяленьне пастаноўлена разьбіць на два аддзяленьні: эканамічнае і кааперацыйнае.

Арганізацыя дэндралёгічнага парку.

Недалёка ад Камароўкі з вясны 1929 г. распачынаецца арганізацыя дэндралёгічнага парку. Парк будзе займаць 100 гект, ня менш, як цапоў гект. на кожную народу дрэў. У парку будуць засаджаны розастайныя пароды дрэў розных кліматаў, з мэтай назіраньня за іх натуралізацыяй, каштоўнасьцю іх і г. д.

Матар'ял для пасадкі будзе атрымачы часткова з выхавальнікаў Савецкага Саюзу, часткова з на-за межаў

Дзеля азнаямленьня з месцам пасадкі рэльефам яго, касьцю глебы гэтымі днямі в Ленінграду прыехалі ў Менск вядомыя спэцыялісты, праф. Эсары Вольф, Кабранаў і Кэрк. Апроч таго, у гэтай працы прымаюць удзел беларускія прафэсары Мельнік і Адамаў.

На 17 мільёнаў руб. тавараў.

Белкаапсаюз заключыў з розныні арганізацыямі цэлы шэраг дагавораў на забесьпячэньне спажывецкай сеткі ў працягу 1928-29 г. таварамі. Заключаны дагаворы на 17 мільёнаў руб. Сюды ўваходзяць такія тавары, як адзеньне, абутак ды інш.

Няма вады.

Ужо звыш 10 дзён, як насельніцтва Кастрычніцкаўскай і Гандлёвай вулік ня мае вады. Прычына адсутнасьці вады гэта тое, што на рагу Кастрычніцкаўскай і Гандлёвай вулік хопула труба, у сувязі з чым Эльвод спыніў падачу вады. Да гэтага часу Эльвод не клапоціцца накіраваць гэту трубу.

На менскай біржы працы.

Новая сэкцыя.

Пры менскай біржы працы арганізавалася спэцыяльная сэкцыя „гарантыйных служачых". Праца сэкцыі—гэта вучот і насылка на працу «гарантыйных служачых».

Патрабаваньні на каменных працаўнікоў павінны прад'яўляцца непасрэдна ў сэкцыю або на тэлефону № 186.

Інагародні попыт на мэдпрацаўнікоў.

Для раёнаў патрэбны працаўнікі ў наступныя раёны.

1. Халоненскую раёна 2 акушэркі і 1 лекпом; 2. Заслаўскую раёбольніцу—3 мэдсястры; 3. Лагойскую дзіцячую кансультацыю 1 мэдсястра; 4. Узьдзенскую раёбольніцу—1 мэдсястра; 5. Зэмбінскую бальніцу—1 лекпом; 6. Смалявіцкі раён (Юр'янўскі і Клюшчі пункт)—2 акушэркі; 7. Смалявіцкую бальніцу—1 мэдсястра; 8. У раёны Зэмбіна, Стальмакова—2 дачтысты.

Бесарабоўным, згодным атрымаць працу на выезд, павінны зьвярнуцца ў разумовую сэкцыю.

Працуючыя, але жадаючыя пераехаць у памянёныя месцы ў нарадку перавозу, павінны таксама зьвярнуцца ў разумовую сэкцыю.

Здарэньні.

Затрыманы зладзеі.

Затрымана шайка малалетніх зладзеяў, у ліку 5 чал., якімі было зроблена шмат крадзяжоў. Затрыманы таксама зладзей рэцыдывіст Войніч, які зрабіў 14 крадзяжоў у Менску.

Фальшывыя квітанцыі.

Група сялян Барысаўскага раёну, у ліку 6 чал. падрабіла квітанцыі Пімінскага дасьвіньтва і атрымала ў Барысаўскім сельскагаспадарчым т-ве на гэтыя квітанцыі 1023 р.

Па гэтай справе вядзецца сьледзтва.

Водгукі на нашы карэспандэнцыі.

У № 269 нашай газэты (за 23 лістапада г. г.) быў зьмешчан артыкул „Недахопы дасьледчых станцый Навукова-Дасьледчага Інстытуту", на які паступіла наступнае тлумачэньне Навукова-Дасьледчага інстытуту:

1. Падзел фэрмы паміж станцыямі (Прылукі—станцыя буйнай ра атай жывёлы. Атоліна—расьліннаводная) бязмоўна адабэцца на жыцьці фэрмы, але гэты падзел вынікаецца необходным, каб даць базу для працы і станцыі расьліннагадоўлі. Пе... Пярэсьце маркуецца вачыніць, бо яно ня здавальняе патрабнасьці як з боку глебавай, так і па плошчы.

Трымаць адну гаспадарку (агульную) на дзьве станцыі, каб уніканць вельмі непажаданага драбленьня інвэнтар'я і інш., нажаль, ня было магчымасьці ў сувязі з тым, што ў справе арганізацыі тэрыторыі (совгасы, выгоны і інш.) заданьні і задачы абедзьвюх станцый не супадаюць і нават супярэчаць адна адной.

2. Пабудова аборы ў Прылуках, г. зн. прызначэньне для ст. буйнай рагатай жывёлы імкнна фэрмы Прылукі (замест скарыстаньня пасьля адпаводнага рамонту, аборы ў Атоліна) было выклікана тым, што Атоліна па ўмовах рэльефу і глебы непадходна было пакінуць за ст. расьліннагадоўлі.

3. Магазин у Менску адчынены для больш прыбытковага і бесспарэднага збыту прадукцыі фэрмы Прылукі.

Адначасовы пролак пралукі іншых гаспадарак забясьпечае павялічэньне скарэтаў і магчымасьць выгрымать адзінай страхавой гаспадаркай.

4. Абора ў Прылуках будзе каштаваць на 15.000 руб., а каля 10.000 руб.

5. Прызначана на каштарысу на станцыю—17.305 р. Выкарыстана ня 20.000 р., а каля 12.000 руб.

6. На набыцьцё быдла на каштарысу 1927-28 г. вызначана 1.500 руб. набыта кароў на 2.318 р. Павялічэньне за кошт часткова скарыстаньня амэрыканскіх сродкаў набыта 16 кароў.

7. Сьвінаводная станцыя ўжо скончыла пабудову сьвінарнікаў і гэтымі днямі ўсе сьвіньні будуць пераведзены ў Сьвінарнік, а часткова (больш палоўцы) ужо пераведзены.

НАВУКА І ТЭХНІКА.

Цэнтральная радыё-лябараторыя ў Ленінградзе.

Трэст заводаў слабага току значна расьпірае цэнтральную радыё-лябараторыю ў Ленінградзе.

Дзеля канцэнтрацыі ўсёй навуковай радыё-працы, у Ленінград пераводзіцца Нижгародская радыё-лябараторыя. На пашырэньне працы новай лябараторыі вызначана 2 з паловай мілёны рублёў.

Дырэктарам лябараторыі прызначан прафэсар М. Бонч-Бруевіч. У цэнтральнай лябараторыі будзе працавець каля 300 інжынэраў і тэхнікаў.

Па разнаму сваёй навукова-дасьледчай і тэхнічнай працы лябараторыя будзе адной з буйнейшых у Эўропе.

Супрацоўніцтва савецкай і амэрыканскай радыё-тэхнікі.

Наладжана ягоза паміж трэстам заводаў слабага току і буйнейшай амэрыканскай радыё-кампаніяй «Радыё-Карпарэйшэн». У зьвязку з гэтым, дзеля азнаямленьня з дасягненьнямі амэрыканскай радыё-тэхнікі выязджае ў Амэрыку група савецкіх спэцыялістаў.

У першую чаргу ў Амэрыку будуць пасылацца дзеля абучэньня і ўзьвышэньня кваліфікацыі маладыя савецкія інжынэры.

У працягу бягучага гаспадарчага году ў Эўропу і Амэрыку будзе пасланы 100 інжынэраў, тэхнікаў і рабочых савецкіх радыё-заводаў.

Матацыкл—танк.

У Нямеччыне выпрабавана новы тып адпаменнага матацыкла, на якім можна ехаць нават па самай благой дарозе. Задняе калясо гэтага матацыкла заменена двухжэйснай гусяніцкай перадачай. Гэта дазваляе матацыклу ісьці па грэблях, падымацца на гару і г. д. Матацыкл мае матор у 4 сілы.

Прыблізна такі-ж матацыкл вывучаецца ў ангельскай арміі. Матор яго ў 6 сіл, хуткасьць ад 50 да 75 кілёмэтраў у гадзіну.

Сухі лёд.

Гэта—навінка амэрыканскай тэхнічнай конці. Дзеля падтрыманьня нізкай тэмпэратуры, там сталі ўжываць замест лёду цьвердую вуглекіслату. Яна здабываецца пры моцнае сьціскальне і затым пры раскоўванне расьпіраньне. Цьвердая вуглекіслата пры сваім расьпіраньні настолькі халадзее, што пераходзіць у сьнег, які затым спрэсоўваецца ў брускі патрэбнай формы і памераў.

Цьвёрдая вуглекіслата акладзена ў дзе разы больш за лёд. Яна ўвесь час сухая, бо іспараецца непасрэдна ў паватра, ня пераходзячы ў жыдкасьць.

Скарыстаньне піла-віньня.

У Амэрыцы надумалі аўсім простым і хуткі спосаб перарабляць пілавіньне ў фібру—цьвёрды матар'ял, які ідзе на аўтамабільныя дзьверы, скрынкі для радыё-апаратуры, на абсталёўку сьцен і г. д.

Пілавіньне спачатку сьмокчэ ў спэцыяльны апарат, у якім яно распыляецца і раздрабляецца на дробныя частачкі. Затым гэта раздробленая маса пераходзе ў гідраўлічны прэс, адкуль выходзе ў выглядзе цьвёрдых аркушаў пакладзеных таўшчыні, прычым адзін бок аркушаў ужо ляжыць шкліраваны.

Шкло, якое ня б'ецца.

Такое шкло ўжо не навіна ў шкляной прамысловасьці. Але нядаўна ў Нямеччыне здабыты шкло тыя абсалютна стойкага шкла, якое выносіць любую кіслату, пры да 100 атмасфэр і на трэскацца пры зьмене тэмпэратуры ад 0 да 160 градусаў.

У прамысловасьці такое шкло будзе мець агромаднае значэньне. Напрыклад, яно будзе ісьці на бабіны для шаўковых фабрык. Шклянныя бабіны к штофным тым, што яны не ўбіраюць у сябе фарбу і лёгка ачышчаюцца.

„Савецкая Беларусь" дапамагла.

ВЯЛЯЦІЦКІ «ЖАНІХ» І ЖАНІШКІ ПАСТАЎЛЕНЫ НА МЕСЦА.

Яшчэ ў жніўні мінулага г. г. селькорам „Бачаўшым" быў прыслан допіс аб старшыні Вялянінскага с.-с. (Барысаўскага раёну) тав. Панкаўну, пад назвай «Вялянінкі жаніх». У допісу вызначалася, як гэты «жаніх» захапіўся каханьнем і запусьціў справы сельсавету, бо з лістапада м-ца 1927 г. мала зьвяртаў увагі на сваю непасрэдную працу. Гледзячы на яго, асабліва на русіяліся і іншыя члены сельсавету. На дзіва, як піша селькор, што ў канцэлярыі сельсавету мышы павілі гнёзды, рэльеі шафу і дабраліся да каштоўных кніг.

Барысаўскі РВК зьвярнуў увагу на гэта зьявішча, калі яму быў пас ан допіс. Факты, паказаныя селькорам, пацьвердзіліся. Частка працаўнікоў с.-с. з працы зьнята. Сам «жаніх» атрымаў адпаведную кару ў партыйным парадку за слабую крапаздольнасьць і, трэба спадзявацца, пры сэрыёзных яму не дазволяцца больш займаць пасаду старшыні сельсавету.

Папраўка.

У № 281 (2469) за 7 сьнежня г. г. у надрукаваным балансе Калініскага Т-ва Узаемнага Крэдыту ўкралася памылка, надрукавана: «Бягучыя рахункі», а трэба — «бягучыя выдатні». У тым ня нумары ў абвестцы таго-ж т-ва надрукавана «Калькавічах» трэба «Клімавічах».

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

У аўторак, 18-XII, а 7 гадз. увечары адбудзецца адчынены сход ячэйкі КП(б)Б працаасьветы. На абвестцы ўнёс—Даклад «Роля школы і настаўніцтва ў інтэрнацыянальным выхаваньні».

Запрашаюцца настаўнікі гор. Менску.

ПЭДГАБІНЭТ.

У сераду, 19 сьнежня, а 8 гадз. увечары адбудзецца сход выкладчыкаў прыродазнаўства II канцэнтру.

На парадку дня: разгляд літаратуры на распрацоўцы ўзятых тэм і арганізацыйныя пытаньні.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту

27 лістапада 1928 году.

Прэзыдыум Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усіх груза-адпраўцаў і груза-атрымальцаў нагружаць і разгружаць грузы ў сурова ўстаноўленыя для нагрузкі і выгрузкі тэрміны і ні ў якім разе не дапушчаць прастояў вагонаў.

2. Не дапушчаць сустрэчных перакідак аднародных грузаў і ні ў якім разе не адпраўляць пустоўна нагружаныя вагоны.

3. У выпадку прыбыцьця грузаў на скончэньні ўстаноўленага для працы тэрміну, у мэтах недапушчэньня прастояў вагонаў, дапушчаць у асобных выпадках правядзеньне разгрузачнай работы і ў звыштэрміновыя гадзіны і ў дні сьвята і адпачынку.

4. Даручыць акруговаму пракурору прыцягваць да судовай адказнасьці асоб, якія дапусьцяць вядбайныя адносіны да скарыстаньня чыгуначнага транспарту, а Акруговай Інспэкцыі Працы мець суровы нагляд за недапушчэньнем злоўжываньняў звышчасовай працай.

Намесьнік Старшыні Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту НАХІЛЬНІЦКІ.

Сакратар Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту КАРАНЕЎСКІ.

ТЭАТР—КІНО.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.

АЎТОРАК, 18 сьнежня.

ЗАЧЫНЕНЫ СПЭКТАКЛЬ.

Спэктакль „НАД НЁМНАМ" для аб'яднанай школы мэталістых і прэваапрацоўшчыкаў, прызначаны на сёньня, пераносіцца на чацьвер 20 сьнежня.

Астача білетаў у касе тэатру.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Мастацкі фільм „Два бранявікі" Звыш праграмы: гастролі БАРЫСА РЭНСКАГА.

КІНО „ЧЫРВОН